Беларуская Грэка-Каталіцкая (Уніяцкая) Царква сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла ў Лёндане

ВЫБРАНЫЯ СЛУЖБЫ З МІНЭІ

# ЧЭРВЕНЬ




Лёндан 2005

**9 чэрвеня**

## МІЖ СЬВЯТЫМІ АЙЦА НАШАГА КІРЫЛЫ, АРХІБІСКУПА АЛЕКСАНДРЫЙСКАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Ты, Кірыла, жэзлам навучаньняў тваіх адагнаў ад Хрыстовае Царквы духоўных ваўкоў, абгарадзіў яе і ўмацаваў словам, і прадставіў яе Хрысту непарушнаю і непахіснаю. Малі Яго выбавіць ад тленнасьці ўсіх, што з вераю спраўляюць пачэсную памяць тваю.

Блаславёны і баганосны Кірыла, ты прасьвятліў свой розум зьзяньнем Духа, і сам быў быццам прамяністае сонца, што пасылае промні сваіх навучаньняў, прасьвятляе ўсіх верных, і адганяе цемру ерасяў сілаю Таго, хто зазьзяў ад Дзевы.

Дабрынёю словаў тваіх Царква ўся ўпрыгожваецца, дабрапачэсна ўзбагачваецца цудоўнымі дабротамі, і шануе сьвятую памяць тваю, Кірыла, прававерных пахвала, айцоў вяршыня, абаронца Усесьвятое Багародзіцы на Саборы.

Слава...

(*Тон 6*). Добры і верны слуга, працаўнік вінаградніка Хрыстовага, ты перанёс дзённую сьпёку, памножыў дадзены табе талент і не пазайздросьціў тым, што прыйшлі пасьля цябе. Таму, Кірыла ойча наш, дзьверы нябесныя адкрыліся табе, і ты ўвайшоў у радасьць Госпада твайго, дзе безупынна молішся за нас.

Цяпер...

*Сьвята, або:*

*Багародзічны (тон 6).* Радуйся, спаўненьне Закону; радуйся, хорам Сьвятое Тройцы; радуйся, Нявеста нятленная; радуйся, носьбітка Ўладара ўсіх; радуйся, духоўны агонь, што носіш у руках Тваіх, быццам у шчыпцах, гарачы вугаль; радуйся, раю новы, садзе зачынены, сьветлае боскае застольле, галубка чыстая, пасадзе Ўсявышняга, Боскае духоўнае ложа, бо Цябе, Дзева, Дух Сьвяты ацяніў.

*Крыжабагародзічны (тон 6).* Калі беззаганная Дзева і Чыстая Уладарка ўбачыла Сына свайго, узьнесенага на крыжы, Яна па-матчынаму заплакала і ў зьдзіўленьні ўсклікнула: "Дзіця мілае, што гэта за новае і дзіўнае зьявішча? Як гэта няўдзячныя людзі аддалі Пілату на суд і асудзілі на сьмерць Жыцьцё ўсіх? Слаўлю Тваю, Слова, невыказную спагадлівасьць."

**Вершапесьні актойху.**

Слава...

(*Тон 6*). Чалавек Божы, верны слуга Гасподні, муж жаданьняў духоўных, выбраны посуд, стоўб і ўмацаваньне Царквы, спадкаемца валадарства, не змаўкай маліцца за нас Госпаду.

Цяпер...

*Сьвята; калі не, то:*

*Багародзічны.* Ніхто, што прыходзіць да Цябе, не адыходзіць пасаромлены, Найчыстая Дзева, але просіць ласкі і атрымлівае дары згодна з просьбаю.

*Крыжабагародзічны.* Калі беззаганная Багародзіца ўбачыла, як Жыцьцё наша вісіць на дрэве, Яна па-матчынаму заплакала і ўсклікнула: "Сыне і Божа мой, збаў тых, што з любоўю славяць Цябе!"

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 8*). Правай веры настаўнік, набожнасьці прыклад і чысьціні, сьветач сусьветны, Богам натхнёная біскупаў аздоба, Кірыла мудры, навукаю тваёю ты ўсіх прасьвятліў, жалейка духоўная. Малі Хрыста Бога за збаўленьне душаў нашых.

Слава ... цяпер...

*Багародзічны:* Непарушнае ўмацаваньне веры і пачэсны дар душаў нашых, Багародзіцу ў песьнях, верныя, узьвялічым: "Радуйся, што ва ўлоньні Тваім зьмясьціла Камень Жыцьця! Радуйся, надзея ўсіх канцоў сьвету, сумных Заступніца! Радуйся, Дзева Маці!"

*Крыжабагародзічны.* Убачыўшы на крыжы расьпятага Цябе, Ягнё і Пастыра, і Збавіцеля сьвету, Маці Твая з плачам казала: "Сыне і Божа мой, сьвет радуецца, атрымаўшы вызваленьне, а сэрца маё гарыць, бачачы Тваё расьпяцьце, якое Ты церпіш за ўсіх."

## 11 чэрвеня

# СЬВЯТЫХ АПОСТАЛАЎ БАЎТРАМЕЯ І ВАРНАВЫ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Сеткаю словаў тваіх, багамоўны апостале Баўтрамею, з глыбіні марнотаў і лютага бязбожжа, ты выцягнуў усе куткі зямлі і прывёў вераю да Хрыста, які даў табе гэтую ласку як вучню і настаўніку боскіх тайнаў.

Сонца славы Ісус Бог наш паслаў цябе, багамудры Баўтрамею, быццам прамень, у сьвет, каб разагнаць туман бязбожжа і прасьвятліць усіх, што сядзелі ў цемры няведаньня, і даць ім у спадчыну сьвятло.

Ты, слаўны Баўтрамею, паслухаўся загаду Таго, чыіх загадаў усё слухаецца, і прыпадобніўся да Яго, як настаўнік праўды. Ты выпіў з радасьцю чашу сьмерці дзеля Крыжа і цяпер прабываеш з Апошняй Мэтай нашых жаданьняў, як спаўжыхар анёлаў і апосталаў.

(*Тон 4*). Ты, апостале, прыняў вялікую ўладу над дэманамі, і сілу адганяць імем Хрыста начальнікаў цемры; ты абышоў усю зямлю і прасьвятліў усіх, быццам сонца, і быў у слаўным Рыме першым прапаведнікам Хрыстовага збавеннага прыйсьця.

Тваё жыцьцё на зямлі, апостале Варнава, падобным было да першаснага стану; як муж сапраўды добры прыродаю, ты быў названы сынам пацяшэньня, і дабрынёю звычаеў тваіх і чысьцінёю розуму ты явіўся шчырым вучнем Хрыстовым.

Арган добра адладжаны дзеяньнем Духа, ты, апостале Варнава, пасьвяціў сябе клікаць усе народы і настаўляць іх да пазнаньня Хрыста словамі і ўчынкамі; ты ўсіх прасьвятліў і навучыў вызнаваць сапраўдную Боскасьць Ісуса, Збавіцеля душаў нашых.

Слава ...: (*Тон 6*). Варнава ўсяхвальны, сьветлы посуд Сьвятога Духа, сын пацяшэньня; перад тым, як ты пазнаў Паўла, ты быў старэйшым сярод сямідзесяці вучняў; пасьля разам з Паўлам прапаведаваў Евангельле па ўсёй зямлі. Споўніўшы пасланства ласкі, ты прынёс сябе Настаўніку твайму як цэлапальную чыстую ахвяру. Маліся заўсёды, просім цябе, апостале слаўны, за збаўленьне душаў нашых.

Цяпер...: *Сьвята, або наступны Дагматык, тон 6:*

Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева, хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Праўдзівы Бог, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве асобы, але ў дзьвюх нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Блаславёная, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Чытаньні** : *гл. службу 29 чэрвеня, с. 32.*

**Вершапесьні**

(*Тон 1*). Па ўсёй зямлі разышлося вашае вучэньне, багавідцы апосталы, і прасьвятліла душы людзей, што зблудзілі, і прывяло іх да Хрыста ласкаю прапаведаваньня. Маліцеся цяпер, каб нашым душам атрымаць супакой і веліч зьмілаваньня.

*Верш*: Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

Сьветачы ясныя Хрыстовыя, посуды пачэсныя, што зьмяшчаюць сьвятло Духа ; царкоўныя стаўпы, небёсы слаўныя, што абвяшчаюць славу Божую: маліце Яго дараваць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

*Верш:* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

Вы, слаўныя, прывялі да Хрыста Бога народы, збаўленыя крывёю Таго, хто захацеў нарадзіцца на зямлі і прыняць крыж і сьмерць. Маліце Яго цяпер дараваць душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Слава...: (*Тон 8*) Апостале Збавіцеля Варнава ўсяхвальны, скарбніца веры, сыне пацяшэньня, ціхі прытулак у буры, мы памятаем пра тваю блізкасьцьць да Бога і таму просім: маліся, каб захавацца ў супакоі душам нашым.

Цяпер...: *Сьвята, або багародзічны нядзельны тон 8:*

Чыстая Дзева, што Бога ў целе невыказна зачала, Маці Бога ўсявышняга, прымі маленьні слугаў Тваіх, Усячыстая, дай ачышчэньне ад правінаў і, выслухаўшы малітвы слугаў Тваіх, маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Адпушчальныя трапары**

*Трапар (тон 3)*: Апосталы сьвятыя, маліце міласэрнага Бога, каб Ён дараваў душам нашым адпушчэньне грахоў.

Слава ... цяпер...: *Трапар сьвята, або наступны нядзельны, тон 3:*

Цябе, Хадайніцу за збаўленьне наша, славім, Багародзіца Дзева, бо целам, якое Ён узяў ад Цябе, Сын Твой і Бог наш на крыжы пацярпеў і як Чалавекалюбец ад тленнасьці выбавіў нас.

### ЛІТУРГІЯ

**Трапар апосталаў**: Апосталы сьвятыя...

**Кандак Варнавы** *(тон 3)*: Ты быў сапраўдным слугою Гасподнім, Варнава, першы з сямідзесяці апосталаў: разам з Паўлам зазьзяў ты прапаведаваньнем тваім і абвяшчаў усім Хрыста Збавіцеля. Дзеля гэтага сёньня ў песьнях славім цябе.

**Кандак Баўтрамея** *(тон 4)*: Апостале Гасподні Баўтрамею, ты явіўся сьвету, быццам яснае сонца, і прасьвятліў зьзяньнем вучэньня твайго і цудамі ўсіх, што шануюць цябе.

**Пракімен** *(Пс 18:5,2)*. Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх і аж да канцоў сьвету словы іх.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

**Апостал**: Дзеяньні 11:19-30

**Алілуя** *(Пс 88:6,8)*. Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю — хоры сьвятых.

*Верш.* Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

**Евангельле**: Лк 10:16-21

**Прычасьнік**. Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх. Алілуя, алілуя, алілуя.

## 12 чэрвеня

## Сьвятога айца нашага Анупрэя

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 8).* Ойча багамудры Анупрэю, ты адлучыўся ад зямных марнотаў і пайшоў да дасканаласьці, бо жадаў быць з Крыніцаю ўсіх дабротаў, і знайшоў там сапраўдную любоў. Прасьветлены ёю, малітвамі тваімі, блаславёны, выхапі нас з грахоўнай цемры.

Ойча багамудры Анупрэю, холад начны і жар дня ты цярпеў у надзеі будучых дабротаў. Ты ўмярцьвіў суставы цела твайго і атрымаў у небе жыцьцё, і ўвайшоў з радасьцю у харомы аглядаць бязьмежную дабрыню Творцы твайго.

Ойча багамудры Анупрэю, быццам вялікі скарб схаваны ў пустыні, слаўны Пафнуцы знайшоў цябе і сьвету расказаў пра твае слаўныя подзьвігі, і ўзбагаціў верных прыкладамі твайго богапрыемнага жыцьця, пераймальнікамі якога зрабі і нас малітвамі тваімі.

Слава... цяпер...

*Багародзічны.* З верай прыбягаю пад Тваё покрыва, Багародзіца чыстая: ад напасьцяў, бедаў, благіх пажаданьняў і д'ябальскай злосьці збаў мяне. Ты, Уладарка — глыбіня міласэрнасьці і хадайніца збаўленьня, бо Ты нарадзіла Бога міласэрнага, адзінага шчодрага і добрасардэчнага.

*Крыжабагародзічны.* Дзева і Маці Твая, Ісусе Уладару, убачыла, як Ты быў прыбіты да крыжа і прыняў мукі, і ўсклікнула з плачам: "Гора мне, Дзіця маё любае! Як гэта церпіш несправядлівыя мукі Ты, што аздараўляеш людзкія нёмачы і ад тленнасьці збаўляеш усіх у міласэрнасьці Тваёй?"

Вершапесьні: *актойху*

Трапар *(тон 1).* Жаданьнем духоўным ты, багамудры Анупрэю, дасягнуў пустыні і, быццам бесьцялесны анёл, шмат гадоў там пражыў у подзьвігах, пераймаючы прарока Ільлю і Хрысьціцеля. Ты атрымаў Боскія тайны з рук анёлаў, і сёньня разам з імі жывеш у сьветласьці сьвятое Тройцы. Маліся за збаўленьне тых, што шануюць памяць тваю.

**Трапар** *(тон 1).* Жаданьнем духоўным ... (*Гл. вышэй*)

**Кандак** *(тон 3)*. Прасьветлены зьзяньнем Сьвятога Духа, ты, сьвяты ойча, пакінуў жыцьцёвыя марнасьці і пайшоў у пустыню, дзе подзьвігамі тваімі ўсьцешыў Найвышэйшага Бога і Творцу. Дзеля гэтага Хрыстос, вялікая Крыніца дароў, праславіў цябе, блаславёны.

## 19 чэрвеня

## Сьвятога Апостала Юды, сваяка Гасподняга

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."**

(*Тон 1*). Юда ўсяхвальны, тваё мудрае прапаведаваньне разышлося, як маланка, па ўсёй зямлі і прывяло пацямнелых ад спакусы бязбожжа да незаходнага сьвятла, у зьзяньні якога сёньня ты жывеш. Прасі для душаў нашых велічы зьмілаваньня.

Юда цудоўны, Хрыстовая калясьніца, ты зьнішчыў ідальскую гордасьць, варожую няволю паланіў словам Божым, і перайшоў да непраміальнага жыцьця. Выпрасі душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Юда, апостале Хрыстовы, вучань уцелаўлёнага Бога, які паслаў цябе як авечку сярод ваўкоў, каб ты словам тваім прывёў усіх да боскага разуменьня сьвятой Тройцы. Дзеля гэтага славім цябе.

Слава...

(*Тон 8*). Ты, Юда апостале, быў залічаны да ліку апосталаў і прыняў ласку Боскага Духа, што вогненным языком зышоў з неба. Выпалі цяпер церне бязбожжа і малі Хрыста Бога за збаўленьне душаў нашых.

Цяпер...

*Дагматык (Тон 8.)* Уладар нябесны дзеля любові да людзей на зямлі зьявіўся і з людзямі пажыў. Ён прыняў цела ад Чыстае Дзевы і, выйшаўшы з Ейнага ўлоньня, стаўся чалавекам. Ён Сын адзіны, двайны прыродаю, але не асобаю. Дзеля гэтага мы праўдзіва прапаведуем і вызнаем Хрыста Бога нашага як дасканалага Бога і дасканалага чалавека. Малі Яго, Дзева Маці, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Чытаньне пасланьня сьвятога Апостала Юды**

Юда, слуга Ісуса Хрыста, брат Якуба, тым, што пакліканыя, умілаваныя ў Богу Айцу і захаваныя для Ісуса Хрыста: ласка вам і мір, і хай любоў вашая памножыцца.

Мілыя мае, я вельмі хацеў пісаць вам аб нашым агульным збаўленьні, але палічыў патрэбным перш заахвоціць вас да змаганьня за веру, раз назаўсёды дадзеную сьвятым. Бо да вас

закраліся нейкія людзі — аб якіх здаўна ўжо вас папярэджвалі, — нязбожныя, што ласку Бога нашага замяняюць на распусту і адзінага Ўладара, Госпада нашага Ісуса Хрыста выракаюцца. Хачу, каб вы прыпомнілі сабе — хоць раз на заўсёды ведаеце ўжо ўсё гэта, — як Госпад, які вызваліў народ з Ягіпту, загубіў тых, што ня ўверылі; як анёлаў — тых, якія не захавалі сваёй годнасьці, але пакінулі ўласнае жыльлё,— зьвязаных вечнымі путамі на суд апошняга дня ў цемры трымае; як Садома і Гамора і суседнія з імі месты, што аддаліся распусьце і пажадлівасьці да чужога цела, панесьлі пакараньне вечным агнём нам на перасьцярогу. Гэтыя ж летуценьнікі чыняць падобнае: апаганьваюць целы, не зважаюць на ўлады, блюзьняць супраць сьветлых анёлаў.

Калі Арханёл Міхал спрачаўся з д'яблам за цела Майсея, ён не наважыўся вынесьці дакорлівага прысуду, але сказаў: "Хай Госпад цябе пакарае." А гэтыя людзі злоўжываюць тым, чаго ня ведаюць, а тое, што спасьцігаюць — прыродаю, як бязмоўныя жывёлы, — абяртаюць на шкоду для сябе. *(1:1-10)*

**Чытаньне пасланьня Сьвятога Апостала Юды**

Мілыя мае, гора тым, што пайшлі шляхам Каіна, паддаліся ашуканству Балаама і атрымалі тую самую заплату; збунтаваліся як Карэй і, як ён, загінулі. Яны — небясьпека на вашых вячэрах любові: яны прыходзяць, каб пажывіцца, і бессаромна толькі аб сабе дбаюць. Яны — бязводныя хмары, што вецер носіць; восенскія дрэвы бясплодныя, двойчы высахлыя, выкараненыя; лютыя хвалі марскія, што пеняцца сваім сорамам; блудныя зоркі, для якіх прызначаная беспрасьветная цемра давеку. Аб іх прарочыў Энох, сёмы патрыярх пасьля Адама: "Вось ідзе Госпад з безьліччу сьвятых сваіх, каб учыніць суд над усімі і пакараць нягоднікаў за ўсе іхнія бязбожныя ўчынкі, і за ўсе блюзьнерскія словы, што казалі супраць Яго нязбожныя грэшнікі." Яны заўсёды наракаюць, ніколі не задаволеныя са свайго лёсу, і чыняць паводле пажаданьняў сваіх. Вусны іх гавораць гордыя словы, і яны зважаюць на асобу дзеля асабістае карысьці. *(1:11-16)*

**Чытаньне пасланьня Сьвятога Апостала Юды**

Мілыя мае, памятайце словы апосталаў Госпада нашага Ісуса Хрыста, калі яны казалі вам, што ў апошні час зьявяцца насьмешнікі, якія будуць паступаць згодна са сваімі благімі пажаданьнямі. Яны спрычыняць падзелы, а самі яны цялесныя і Духа ня маюць. Вы ж, мілыя, будуйце на цьвёрдай аснове вашай сьвятой веры, і маліцеся ў Духу Сьвятым; захоўвайце сябе ў любові Божай і чакайце ад Госпада нашага Ісуса Хрыста зьмілаваньня, што вядзе да жыцьця вечнага. Калі ёсьць такія, што

маюць сумнівы, вы іх пераканайце ў веры, ратуючы, каго можна, з агню. Але ёсьць і такія, з якімі вам трэба абыходзіцца ветліва, але асьцярожна, і трымацца здалёку нават ад вопраткі, апаганенай целам. Таму ж, хто можа захаваць вас ад падзеньня і паставіць беззаганнымі і радаснымі перад славаю сваёю, адзінаму Богу, Збавіцелю нашаму праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага, хвала і веліч, сіла і ўлада сёньня і на ўсе вякі. Амін. *(1:17-25)*

**Вершапесьні**

(*Тон 4*).Ты, апостале, прыняў уладу над дэманамі; адганяючы імем Хрыста начальнікаў цемры, ты абышоў усю зямлю і, быццам сонца, прасьвятліў усіх навукаю і прапаведаваньнем першага збаўеннага прыйсьця Хрыстовага.

*Верш.* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

Тваё жыцьцё на зямлі, апостал Юда, сваяк Гасподні, было падобным да першаснага стану; дабрынёю звычаёў тваіх і чысьцінёю розуму ты явіў сябе шчырым вучнем і пераймальнікам Хрыста.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

Арган добра адладжаны Боскім стараньнем, ты, апостале Юда, прысьвяціў сябе клікаць усе народы і настаўляць іх да пазнаньня Хрыста словамі і ўчынкамі; ты ўсіх прасьвятліў і навучыў вызнаваць сапраўдную Боскасьць Ісуса, Збавіцеля душаў нашых.

Слава...

(*Тон 2*). Поўны Боскай руплівасьці, ты, дастойны Юда апостале, дбаў старанна аб справах Бога ўсемагутнага, які напоўніў цябе сваімі цудамі. Цяпер, на вышынях разам з нябеснымі сіламі, малі, богасузіральнік, Слова Хрыста Бога нашага дараваць нам багацьце зьмілаваньня свайго.

Цяпер...

*Багародзічны нядзельны (тон 2).* Новы цуд, большы за ўсе ранейшыя цуды! Хто калі бачыў Маці, якая радзіла бяз мужа і на руках насіла Таго, хто трымае ўсё стварэньне? З Божай волі радзіўся Той, каго Ты, Усячыстая, насіла як дзіцятка на руках Тваіх. З матчынай сьмеласьцю не пераставай маліць Яго за тых, што

шануюць Цябе, каб Ён дараваў багацьце ласкі сваёй і збавіў душы нашыя.

**Адпушчальныя трапары**

***Апостала** (тон 1).* Мы ведаем цябе, Юда, як сваяка Гасподняга і славім як непахіснага мучаніка, што перамог спакусу і веру захаваў. Дзеля гэтага сёньня сьвяткуем сьветлую памяць тваю і малітвамі тваімі атрымліваем адпушчэньне грахоў.

Слава.... цяпер....

***Багародзічны нядзельны** (тон 1).* Як толькі пачуўся голас Габрыеля, які казаў Табе, Дзева: "Радуйся!", Уладар усіх узяў цела ад Цябе, сьвятая Скарбніца, як прадказаў праведны Давід. Ты сталася больш прасторнай за неба, бо насіла ў сабе Творцу ўсяго. Слава Таму, хто пасяліўся ў Табе; слава Таму, хто выйшаў з Цябе; слава Таму, хто вызваліў нас нараджэньнем сваім.

ЛІТУРГІЯ

**Трапар** *(тон 1).* Мы ведаем цябе, Юда... (*Гл. вышэй*)

**Кандак** *(тон 2).* Ты быў абраным вучнем, цьвёрдым розумам, і непахісным стаўпом Царквы Хрыстовае. Ты абвясьціў народам Хрыстовае слова і навучыў іх верыць у Бога адзінага; праслаўлены Ім, ты атрымаў дар аздараўленьняў, каб лячыць немачы тых, што прыбягаюць да цябе, апостале слаўны Юда.

**Пракімен** *(Пс 18:5,2).* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.
*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

**Апостал:** Юда 1:1-10

**Алілуя** *(Пс 88:6,8).* Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю — хоры сьвятых.
*Верш.* Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

**Евангельле:** Ян 14:21-25

**Прычасьнік.** Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

## 24 чэрвеня

# НАРАДЖЭНЬНЕ СЬВЯТОГА СЛЎНАГА ПРАРОКА, ПРАДВЕСЬНІКА І ХРЫСЬЦІЦЕЛЯ ЯНА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*): Ян сваім нараджэньнем разьвязвае Захараву немату, бо ня мусіў бацька маўчаць, калі Голас прыйшоў. За тое, што не паверыў, язык ягоны анямеў, але сёньня прыйсьце Яна вызваляе яго. Той, пра якога было аб'яўлена Захару, — голас Слова і прадвесьнік Сьвятла — сёньня родзіцца і моліцца за душы нашыя. (*Двойчы*)

Сёньня голас Слова разьвязвае бацькавы язык, што дзеля няверства анямеў, і вызваленьнем маці свае ад няплоднасьці прадвяшчае шматдзетнасьць Царквы. Сьветач прыходзіць перад Сьвятлом, зорка абвяшчае прыйсьце Сонца справядлівасьці для аднаўленьня ўсіх і збаўленьня душаў нашых.

Перш як Бог-Слова нарадзіўся ад Дзевы, прадвесьнік Ягоны зьявіўся са старэчага ўлоньня — вялікі між народжаных ад жанчаны і першы сярод прарокаў. Бо трэба было Боскім справам мець слаўны пачатак: дзіця ў старасьці, і бясьсеменнае зачацьце. Госпадзе, што чыніш цуды для нашага збаўленьня, слава Табе!

Сёньня зьявіўся вялікі прадвесьнік, што нарадзіўся з няплоднага ўлоньня Альжбеты, найболшы з усіх прарокаў, роўнага якому няма і ніколі не было. Бо вось Сьвятло яснае прыйшло за прадвесьнікам-сьветачам, за голасам — Слова, і Жаніх за прыяцелем. Ян рыхтуе народ Госпаду ачышчэньнем вадою перад прыйсьцем Духа. Нашчадак Захара і гадунец пустыні, пакаяньня прапаведнік, ачышчэньне правінаў, ён прапаведаваў тым, што ў пекле, з мёртвых устаньне і моліцца цяпер за душы нашыя.

Ты, Хрысьціцелю Хрыстовы Яне, быў прарокам і прадвесьнікам ад улоньня маці! Ты ўсьцешыўся ва ўлоньні яе, калі пачуў, што прыйшла Ўладарка да слугі, носячы Спрадвечнага, які нарадзіўся ад Айца бяз маці. Яна прыйшла да цябе, які, згодна з абяцаньнем, зазьзяў ад няплоднае і старое. Малі Госпада за зьмілаваньне душаў нашых.

Слаўны цуд! Захар не паверыў словам анёла, які абвяшчаў зачацьце Альжбеты і нараджэньне сына, і сказаў: "Як яна народзіць, калі я ўжо стары, а ейнае ўлоньне замерла?" Дзеля гэтага за няверства сваё быў ён пакараны нематою. Сёньня ж ён убачыў

абяцанае нараджэньне, і немата яго разьвязалася. Узрадаваны, ён усклікнуў: "Блаславёны Госпад Бог Ізраіля, што наведаў і збавіў свой народ, і дараваў сьвету веліч зьмілаваньня!"

Яне ўсяхвальны, сусьветны апостале! Ты — спаўненьне Габрыелявага абяцаньня пра нараджэньне ад няплоднае, гадунец выдатны пустыні і прыяцель шчыры Жаніха-Хрыста. Малі Яго за збаўленьне душаў нашых.

Слава...

(*Тон 6*). Сёньня сьветач Сьвятла, быццам сьветлая заранка, рыхтуе шлях прыйсьцю Бога-Слова. Сёньня язык Захара, што анямеў на загад анёла, разьвязваецца зноў. Бо не выпадала бацьку захоўваць маўчаньне, калі прыйшоў голас, што нарадзіўся ад няплоднае, каб прапаведаваць сьмела збаўленьне ўсяму сьвету.

Цяпер ...

(*Тон 6*). Альжбета зачала Прадвесьніка Ласкі, а Дзева — Госпада славы. Абедзьве маткі прывіталіся, і немаўлятка радасна заварушылася ва ўлоньні: так слуга ўславіў Уладара. Маці Прадвесьніка, уражаная, усклікнула: "Адкуль мне гэта, што Маці Госпада майго прыйшла да мяне? Хай Ён у міласэрнасьці сваёй збавіць людзей бездапаможных."

**Чытаньне кнігі Роду**

Бог сказаў Абрагаму: "Жонка твая ня будзе называцца Сараі, але імя яе будзе Сара. Пабласлаўлю яе і дам табе ад яе сына, і буду ўсьцяж бласлаўляць яе, так што яна станецца маці многіх, і ўладары будуць нашчадкамі яе." Абрагам, упаўшы тварам ніц, засьмяяўся, бо падумаў у сабе: "Ці ж можа нарадзіцца сын ад стогадовага чалавека, або ці можа дзевяностагадовая Сара стацца маці?" Але Бог яму на гэта: "Сапраўды, Сара народзіць табе сына, якому дасі імя Ісаак. Я заключу з ім саюз, саюз вечны з ім і з яго нашчадкамі, што будуць пасьля яго." Абрагам і Сара састарэліся шмат. І таму Сара засьмяялася і падумала ў сабе: "Як жа магу я нарадзіць цяпер, дый муж мой стары?" Госпад сказаў Абрагаму: "Чаму Сара сьмяецца і думае — ці сапраўды змагу нарадзіць, састарэўшыся? Ці ёсьць што-небудзь немагчымае для Госпада?" Нарэшце Госпад паказаў ласку Сары і ўчыніў ёй, як абяцаў. Сара зацяжарыла і нарадзіла старому Абрагаму сына ў час, вызначаны Богам. Абрагам даў сыну, якога нарадзіла яму Сара, імя Ісаак, як загадаў яму Бог. І абрэзаў Абрагам Ісаака, калі яму было восем дзён, як загадаў яму Бог. Абрагаму было сто гадоў, калі нарадзіўся сын ягоны Ісаак. Сара казала: "На сьмех

выставіў мяне Госпад. Кожны, хто пачуе пра гэта, сьмяяцца будзе з мяне." І дадала: "Хто мог бы сказаць Абрагаму, што Сара будзе карміць дзяцей? Бо ў ягонай старасьці я нарадзіла яму сына." Калі дзіця падгадавалася і было адлучанае ад грудзей (маці), Абрагам у той дзень справіў вялікую бяседу. *(17:15-17,19;18:11-14;21:1-8)*

**Чытаньне кнігі Судзьдзяў**

У той час жыў нейкі чалавек з пакаленьня Дана, на імя Маноах. Жонка яго была няплодная і бязьдзетная. Анёл Гасподні зьявіўся гэтай жанчыне і сказаў: "Вось ты няплодная і дзяцей ня маеш, але ты зачнеш і народзіш сына. Толькі сьцеражыся, ня пі віна і ніякага хмяльнога напою, і ня еш нічога нячыстага. Вось зачнеш і народзіш сына, і хай брытва не дакранецца да галавы яго, бо хлапчо ад улоньня матчынага будзе прысьвечанае Богу, і пачне вызваленьне Ізраіля з рук філістынаў." Пайшла жанчына да мужа свайго і расказала яму наступнымі словамі:"Прыйшоў да мяне муж Божы. Выгляд яго быў быццам выгляд Божага анёла — поўны велічы. Я не пытала яго, адкуль ён прыйшоў, а ён не сказаў мне свайго імя. Сказаў мне: Вось зачнеш і народзіш сына, але толькі ад гэтай хвіліны ня пі віна і ніякага хмяльнога напою і ня еш нічога нячыстага, бо дзіця будзе прысьвечанае Богу ад матчынага ўлоньня аж да сьмерці." Тады Маноах памаліўся Госпаду, кажучы: "Прашу Цябе, Госпадзе, няхай муж Божы, якога Ты паслаў, прыйдзе яшчэ раз да нас і няхай навучыць нас, што нам трэба рабіць з дзіцем, якое мае нарадзіцца." І прыйшоў анёл да Маноаха і сказаў: "Усяго, што я сказаў жонцы тваёй, хай высьцерагаецца; няхай не спажывае нічога, што зробленае з вінаграду, ня п'е ні віна ні хмяльнога напою." Спытаў Маноах анёла Гасподняга: "Як імя тваё, каб мы, калі споўняцца словы твае, маглі цябе ўшанаваць?" І адказаў яму анёл Гасподні: "Чаму пытаешся пра імя маё? Яно тайнае." І не зьявіўся больш анёл Гасподні Маноаху, ані жонцы яго. *(13:2-8,13-14,17-18,21)*

**Чытаньне кнігі прарока Ісаі**

Так кажа Госпад: "Пацяшайце, пацяшайце людзей маіх — кажа Бог, — прамаўляйце да сэрца Ерусаліму і абвяшчайце яму, што час службы ягонай скончыўся, што ўжо адпакутаваная няправеднасьць яго, бо ён прыняў падвойную кару ад рукі Гасподняй за ўсе грахі свае." Голас разьлягае ў пустыні: "Рыхтуйце дарогу Госпаду, простымі рабіце сьцежкі Богу нашаму." Узыдзі на высокую гару, ты, што нясеш добрую вестку Сыёну. Уздымі голас свой, ты, што прыносіш радасную вестку Ерусаліму. Уздымі голас, ня бойся, кажы: "Я Бог ваш! Я пачую голас бедных Ізраіля, не пакіну іх. Выпушчу рэкі з гораў, ручаі сярод поля; заменю пустыню на

поплаў, а высахлую зямлю на крыніцы водныя." Узрадуйцеся, нябёсы на вышыні, ліце, хмары, справядлівасьць на зямлю. Хай зямля адкрыецца, хай збаўленьне дасьць плод свой, хай прарасьце справядлівасьць. Голасам вясельля абвяшчайце гэта, хай будзе чутны ён аж да краёў зямлі. Распавядайце, як вызваліў Госпад слугу свайго Якуба. Не зазналі яны смагі, калі Ён іх вёў праз пустыню: Ён загадаў вадзе біць крыніцай са скалы. Узрадуйся, няплодная, што ніколі не нараджала, усклікні радасна ты, што ня зьведала родавых боляў: бо больш дзяцей у пакінутай, як у той, што мае мужа. (*40:1-3,9; 41:17-18; 45:8; 48:20-21; 54:1*)

**Ліцьця**

(*Тон 1*). Струменьце, горы, слодыч; узгоркі, быццам ягняты, скачыце! Бо вось нарадзіўся ад Альжбеты, каб з намі пажыць, Прадвесьнік Гасподні. Нараджэньнем сваім ён разьвязаў бацькава маўчаньне. Дык засьпявайма яму: "Хрысьціцелю Хрыстовы, маліся за збаўленьне душаў нашых."

Богам пасланы голас, сьветач Сьвятла, Прадвесьнік Гасподні, першы між прарокаў Хрыстом засьведчаны, у малітве за ўвесь сьвет памятай пра статак твой, каб яму захавацца ад шкоды.

Ты, Яне прароча і прадвесьніку, быў прапаведнікам Ягняці Божага і Слова, якога Ты паказаў сьвету ўсяму, кажучы: "Вось Ягнё Божае, што бярэ на сябе грахі сьвету і дае ўсім веліч зьмілаваньня свайго."

Слава ...

(*Тон 5*). Сёньня Альжбета з радасьцю нараджае апошняга з прарокаў, пачатак апосталаў, зямнога анёла і нябеснага чалавека, голас Слова, воя і прадвесьніка Хрыстовага, які радасна заварушыўся ва ўлоньні маці, калі пачуў Абяцанага, і перад сваім нараджэньнем абвясьціў Сонца справядлівасьці. Дзівіцца Захар у старасьці, пазбыўшыся путаў бязмоўя, і бацька Голасу пачынае яўна прарочыць: "Ты, хлапчо, назавешся прарокам Усявышняга і пойдзеш перад Ім рыхтаваць шлях Яму." Дзеля гэтага, анёле, прароча, апостале, вою, хрысьціцелю і прапаведніку пакаяньня, што, як голас Бога-Слова, вядзеш усіх да Сьвятла, маліся няспынна за нас, якія шануем з вераю памяць тваю.

Цяпер...

Ты — сьвятыня і брама, хорам і пасад Уладара, Дзева ўсячыстая. Праз Цябе зьявіўся мой Збавіцель, Госпад Хрыстос, тым, што былі ў цемры, як Сонца справядлівасьці, каб прасьвятліць

створаных рукою сваёю на свой вобраз. Дзеля гэтага, Усяслаўная, што маеш матчыную ласку і давер у Яго, няспынна маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Вершапесьні**

(*Тон 2*). Псалмамі, і гімнамі, і песьнямі духоўнымі ўшануем прарока прарокаў, плод няплоднай, найбольшага сярод народжаных ад жанчыны, грамадзяніна пустыні, Яна слаўнага, і скажам: Хрысьціцелю і Прадвесьніку Збавіцеля, тваім нараджэньнем ты паказаў, што маеш вялікую ласку і давер у Хрыста. Дык маліся няспынна, каб Ён даў супакой сьвету і душам нашым багацьце зьмілаваньня свайго.

*Верш.* Блаславёны Госпад, Бог Ізраіля, які наведаў і вызваліў народ свой.

Прыйшоў сёньня на сьвет голас ласкі Слова, прапаведнік Сонца, што нарадзіўся, згодна з абяцаньнем, ад няплоднай і бязьдзетнай, Ян Прадвесьнік. Цешцеся, людзі, бо ён прыйшоў, каб прыгатаваць шлях Збавіцелю — якому ён радасна пакланіўся яшчэ ва ўлоньні маці сваёй, — Ягняці, што бяре на сябе грахі сьвету і дае нам веліч зьмілаваньня свайго.

*Верш.* І ты, хлапчо, прарокам Усявышняга назавешся.

Той, хто асьвяціўся ва ўлоньні маці і атрымаў ласку прароцтва, сёньня родзіцца ад няплоднае і прапаведуе ясна прыйсьце Госпада: "Пакайцеся, бо наблізілася валадарства нябеснае."

Слава ...

(*Тон 8*). Сёньня, у нараджэньні Яна, найбольшага з прарокаў, споўнілася сказанае прарокам Ісаяю: "Вось Я пасылаю анёла перад абліччам Тваім, які падрыхтуе шлях Табе. Жаўнер апярэджвае нябеснага Ўладара, каб роўнымі зрабіць сьцежкі справядлівасьці Богу нашаму." Ён палюбіў устрыманасьць і чысьціню і, сам чалавек, стаўся падобным да анёла спосабам жыцьця свайго, у змаганьні з прыроднымі нахіламі сваімі і ў імкненьні да звышпрыроднага. Дык, усе верныя, будзем старацца пераймаць яго ў дабрадзейнасьцях і прасіць маліцца за збаўленьне душаў нашых.

Цяпер...

Гляньма на Альжбету, якая кажа Дзеве Марыі: "Адкуль мне гэта, што прыйшла да мяне Маці Госпада майго? Ты носіш

Уладара, а я жаўнера, Ты Заканадаўца, а я слугу Закону, Ты — Слова, а я — голас, што абвяшчае Валадарства Нябеснае."

**Адпушчальныя трапары**

*Трапар Хрысьціцелю (тон 4).* Прарок і прадвесьнік прыйсьця Хрыстовага, мы, што з любоўю шануем цябе, ня ведаем як усхваліць цябе дастойна: слаўнае нараджэньне тваё паклала канец няплоднасьці маці і бацькавай немаце і сталася пачаткам абвяшчэньня прыйсьця Сына Божага. ~~(Двойчы)~~

Багародзіца Дзева, радуйся, поўная ласкі Марыя, Госпад з табою: благаслаўлёная Ты між жанчынаў і благаслаўлёны плод улоньня Твайго, бо Ты нарадзіла Збавіцеля душ нашых. (2)

## ЮТРАНЬ

**Пасля "Госпад — Бог...":**

***Трапар Хрысьціцеля.*** Прарок і прадвесьнік... (*Гл. вышэй*)

Слава ... цяпер ...

***Багародзічны** (тон 4).* Тайна, спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая, праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, якім уваскрасіў першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

**Першая сядальная песьня** *(тон 4).* Сёньня зацьвіў нам парастак Захара, краса пустыні і моц прароцкая, і весяліць сэрцы верных. Прадвесьнік Хрыстовы і сапраўдны сьведка Ягонага прыйсьця зьявіўся нам. Дык уславім Хрысьціцеля ў духоўных песьнях і ўсклікнем: "Прарок і прапаведнік праўды, маліся за збаўленьне душаў нашых."

Слава... цяпер...: Язэп дзіву даўся, калі ўбачыў надпрыроднае зачацьце Тваё, Багародзіца, але згадаў дождж, што зышоў на руна, і куст вогненны, што не згараў, і кій Аарона, што зацьвіў. І вось, заручаны Твой і ахоўнік засьведчыў перад сьвятарамі, кажучы: "Дзева родзіць і пасьля родаў дзеваю застаецца."

**Другая сядальная песьня** *(тон 8).* Ты, Яне слаўны, прадвесьнік прыйсьця Хрыстовага, сёньня нарадзіўся. Найбольшы з прарокаў і голас Слова, ты клікаў: "Пакайцеся, бо валадарства нябеснае ўжо блізка." Ты явіўся сьвету як прадвесьнік ласкі, хрысьціцель і апостал, што рыхтуе шлях Госпаду. Малі цяпер Хрыста Бога

дараваць адпушчэньне правінаў тым, што з любоўю сьвяткуюць памяць тваю.

Слава... цяпер...: Усесьвятая Дзева, Маці Хрыста, душы маёй лютыя страсьці ацалі, і дай мне пазнаць мае правіны, якія я, неразумны, учыніў, апаганіўшы душу і цела. Гора мне! Што буду рабіць, калі анёлы адлучаць маю душу ад шматцерпнага цела ? У той час, Уладарка, будзь мне надзейнай заступніцай: бо я, слуга Твой, усю надзею на Цябе ўсклаў.

**Паліелей**: Хваліце імя Господняе...

**Узьвялічваньне**. Узьвялічваем Цябе, Прадвесьніку Збавіцеля Яне, і славім тваё слаўнае ад няплоднае нараджэньне.

*Верш 1.* Блаславёны Госпад, Бог Ізраіля, бо Ён наведаў і ўчыніў збаўленьне людзям сваім.

*Верш 2.* Ён узьняў рог збаўленьня нашага, у доме Давіда, слугі свайго.

*Верш 3.* І ты, дзіця, будзеш звацца прарокам Усявышняга.

*Верш 4.* Пойдзеш перад Госпадам, прыгатаваць дарогу Яму.

Слава... цяпер...

Алілуя, алілуя, алілуя. Слава Табе Божа. (*Тройчы*)

**Сядальная песьня** *(тон 8).* Радуйся, бацька, і цешся, маці, бо, згодна з абяцаньнем, вы нарадзілі прарока Божага і прадвесьніка. Няплодная корміць Хрысьціцеля, і Захар радуецца нараджэньню і кажа: "Мой язык быў разьвязаны прыйсьцем тваім, сьветач вялікага Сьвятла." Сапраўды вялікі цуд!

Слава... цяпер...: Дзякуем Табе няспынна, Багародзіца, узьвялічваем Цябе, Чыстая, славім у песьнях сынараджэньне Тваё, Поўная ласкі, і клічам: "Збаў нас, усеміласэрная і добрая Дзева, у часе страшнага суду адгані ад нас сілу дэманаў і ня дай слугам Тваім быць пасаромленымі."

**Узыходная песьня**: *Першы антыфан 4 тону.*

**Пракімен**. І ты, дзіця, будзеш звацца прарокам Усявышняга.

*Верш.* Блаславёны Госпад, Бог Ізраіля, які наведаў і вызваліў народ свой.

### Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Лукі

У той час Альжбета, жонка Захара, зачала і таілася пяць месяцаў, кажучы: "Так мне ўчыніў Госпад, калі глянуў ласкава і зьняў з мяне ганьбу сярод людзей."

Тым часам надышоў час Альжбеце радзіць, і яна нарадзіла сына. Калі ейныя суседзі і сваякі пачулі, што Бог аказаў ёй

вялікую міласэрнасьць, яны ўсьцешыліся разам з ёю. На восьмы дзень яны прыйшлі, каб абрэзаць дзіця, і хацелі даць яму імя ягонага бацькі — Захар. Але маці ягоная сказала: "Не, ён будзе называцца Янам." Ёй адказалі: "Ніхто ў тваім родзе ня мае гэтага імя." Тады спыталіся знакамі ў бацькі ягонага, як бы хацеў яго назваць. А ён папрасіў таблічку і напісаў: "Імя яму — Ян." І ўсе зьдзівіліся. І адразу адчыніліся ягоныя вусны, і разьвязаўся язык, і ён загаварыў, бласлаўляючы Госпада. І страх ахапіў усіх суседзяў іхніх, і расказвалі пра ўсё гэта па ўсёй горнай краіне Юдэйскай. Усе, што чулі, бралі сабе гэта да сэрца і пыталіся: "Кім будзе гэтае дзіцятка?" Бо сапраўды рука Гасподняя была на ім. А Захар, бацька ягоны, напоўніўся Духам Сьвятым, і прарочыў, кажучы: "Блаславёны Госпад, Бог Ізраіля, які наведаў і вызваліў народ свой. І ты, дзіцятка, будзеш звацца прарокам Усявышняга, бо пойдзеш перад Госпадам, каб падрыхтаваць сьцежкі Яму." А хлопчык рос і ўмацоўваўся духам, і жыў у пустых мясьцінах аж да дня свайго зьяўленьня перад Ізраілем. *(1:24-25, 57-68, 76, 80)*

**Псалом 50.** *Пасьля:*

Слава...: Малітвамі Прадвесьніка, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Цяпер...: Малітвамі Багародзіцы, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Зьмілуйся нада мною...: *(Тон 2).* Той, хто асьвяціўся ва ўлоньні маці і атрымаў ласку прароцтва, сёньня родзіцца ад няплоднае і прапаведуе ясна прыйсьце Госпада: "Пакайцеся, бо наблізілася Валадарства нябеснае."

**Канон**
(*Тон 4*)

**Песьня 1.** *Ірмас.* Сын Дзевы патапіў у глыбіні бясстраснасьці тройчы сьвятое душы моцныя калясьніцы ворага; дык малюся: "Умярцьвіўшы цела, дай мне зайграць, быццам на цымбалах, пераможную песьню."

*Прыпеў.* Сьвяты прадвесьніку і хрысьціцелю Яне, малі Бога за нас.

Быццам ясная раніца, што апярэджвае Сонца, сын няплоднае яўна прапаведуе ўсяму сьвету Сына Дзевы. І вось усёй зямлі зазьзяла сьвятло ласкі і дабрадзейнасьці.

Захар, натхнёны Духам, усклікнуў: "Ты, Яне ўсяхвальны, сапраўды будзеш звацца прарокам Усявышняга і будзеш ісьці перад абліччам Хрыста, каб прыгатаваць шлях Творцу."

Захар чуў голас Габрыеля, але не паверыў боскаму аб'яўленьню, і быў пакараны нематою, ад якое быў вызвалены нараджэньнем Яна, прадвесьніка Слова.

Слава... цяпер...

*Багародзічны.* Горад Божы, Уладара ўсіх добрапрыемнае Сховішча, пачэсны Скарб, Багародзіца ўсебеззаганная, захавай набытак Твой, што няспынна славіць Цябе і ў веры пакланяецца сынараджэньню Твайму.

*Катавасія.* Адчыню вусны мае.... (*гл. с. 48*)

**Песьня 3.** *Ірмас.* Ня мудрасьцю і сілаю, і не багацьцем хвалімся, але Табою, Хрысьце, увасобленая Мудрасьць Айца. Ніхто не сьвяты, апроч Цябе, Чалавекалюбча.

Уладар родзіцца ад Дзевы, а любы слуга ад старой няплоднай маці: цуд апярэджвае другі, большы, цуд.

Старая і няплодная цалуе Дзеву Маці, пазнаўшы непамыльна Ейнага Сына. Путы няплоднасьці разьвязваюцца Божай воляю.

*Багародзічны.* Ты, што, ня знаўшы мужа, нарадзіла ў целе Бога, ад нападаў злых жаданьняў, што мяне апаноўваюць, захавай мяне: ня маю іншай памочніцы, апроч Цябе, Усячыстая.

**Сядальная песьня** *(тон 8).* Голас быў вернуты Захару, калі нарадзіўся голас і прадвесьнік Слова, які выявіў няплоднасьць закону, клічучы: "Пакайцеся, людзі, бо вось ідзе Ісус, каб вызваліць усіх ад першага праклёну!" Сапраўды вялікі і слаўны цуд!

Слава...: *(тон 8).* Быццам сьветлае сонца, з улоньня Альжбеты зазьзяў нам сын Захара і разьвязаў бацькаву немату; з вялікай сілаю і сьмеласьцю ён заклікаў усіх людзей: "Праступіце шлях Госпаду, бо Ён вызваліць і збавіць тых, што прыходзяць да Яго." Малі, Яне, Таго, каго ты прапаведаваў, за збаўленьне душ нашых.

Цяпер...: Ты, Усячыстая, абнавіла боскім сынараджэньнем Тваім сатлелую сьмяротную людзкую прыроду; і ўзьняла ўсіх ад сьмерці да жыцьця нятленнага. Дзеля гэтага мы, як Ты прадказала, завем Цябе шчасьліваю, Найблаславёная Дзева.

**Песьня 4.** *Ірмас.* Хрыстос, Бог спрадвечны, што сядзіць у славе на боскім пасадзе, прыходзіць на хуткай хмары і нятленнай рукою збаўляе тых, што клічуць: "Слава, Хрысьце, сіле Тваёй."

Таямніца апярэджвае невыказныя таямніцы Твае, Хрысьце, і адменаю прыроднага закону прадвяшчае вызваленьне ад цярпеньняў, выпраўленьне і абагаўленьне.

Ісая, натхнёны Айцом, прарочыў Сыну, які меў прыняць цела, вестуна, на зямлі народжанага, роўнага анёлам; ён казаў: "Вось пасылаю перад абліччам Тваім таго, які будзе клікаць: Слава, Хрысьце, сіле Тваёй!"

"Я прыйшоў на сьвет на тое, каб паслужыць Уладару, абвясьціць Ягонае прыйсце, і зачацьцем маім ад няплоднае старое маці апярэдзіць Ягонае нараджэньне ад Дзевы."

*Багародзічны.* У Табе, сьвятая Багародзіца, захацела пасяліцца, быццам у цудоўным хораме, Слова Божае Айца, захаваўшы Цябе непарушнаю, і Ты нарадзіла Эмануэля — Бога і чалавека.

**Песьня 5.** *Ірмас.* "Сёньня ўстану — па-прароцку сказаў Бог, — сёньня ўслаўлюся, сёньня ўзьнясуся і, успрыняўшы ад Дзевы заняпалую людзкую прыроду, уздыму яе да Майго Боства.

Зямля прарасьціла сапраўднага прапаведніка, голас, што языком Духа прапаведаваў усім Сына Дзевы, Праведнасьць, што зышла да нас з неба ў целе.

Госпад сапраўды паставіў цябе сьветачам Хрыстовым, што ўсіх прасьвятляе, апранае ў сорам, быццам у вопратку, варожа настаўленых, і праведна прапаведуе Божага Сына-Слова.

Усё стварэньне цешыцца з твайго боскага нараджэньня; ты, прадвесьнік, явіўся нам зямным анёлам і нябесным чалавекам і прадвясьціў прыйсьце ў целе Бога нябеснага.

*Багародзічны.* Адзінародны Сын, Спрадвечнае і неразьдзельнае Слова Айца, нарадзіўся ад Цябе, Дзева, у целе дзеяньнем Сьвятога Духа.

**Песьня 6.** *Ірмас.* Я патрапіў у глыбіню марскую і таплюся ў буры многіх грахоў, але Ты, Божа, выратуй мяне ў міласэрнасьці Тваёй.

Як прарок ты, яшчэ ў матчыным улоньні, быццам у цёмным хораме, пазнаў Бога-Слова і, прасьветлены недасяжным сьвятлом, матчыным языком уславіў Яго.

Як голас, што кліча ў пустыні, малі няспынна, Хрысьціцелю, Збавіцеля сьвету, каб вызваліцца ад духоўнай нясплоднасьці тым, што славяць тваё нараджэньне.

*Багародзічны.* Селішчам недаступнага Боства явілася ўлоньне Тваё, Багародзіца, на якую нябесныя хоры без страху ўзірацца ня сьмеюць.

**Кандак** *(тон 3).* Няплодная сёньня родзіць прадвесьніка Хрыстовага, які зьдзяйсьняе ўсе прароцтвы: усклаўшы ў Ярдане руку на Таго, каго прадказалі прарокі, ён паказаў сябе прарокам, прапаведнікам і прадвесьнікам Бога Слова.

*Ікас.* Усхвалім сёньня Прадвесьніка Гасподняга, якога нарадзіла сьвятару Альжбета з няплоднага ўлоньня, але не бяз семя. Адзін толькі Хрыстос бяз семя прайшоў непраходнае ўмяшчалішча. Няплодная нарадзіла Яна, але не бяз мужа. Ісуса ж нарадзіла Дзева чыстая, ацяненьнем Айца і Духа Божага. Народжаны ад няплоднае быў для Таго, хто нарадзіўся ад Дзевы, прарокам, прапаведнікам і прадвесьнікам Бога Слова.

**Песьня 7.** *Ірмас.* Тры юнакі ў Бабілёне адкінулі блюзьнерскі загад мучыцеля і сярод полымя гукалі: "Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых!"

Некалі прырода людзкая была ў змроку; але ты, прадвесьніку, зьявіўся, быццам раніца, і ўсклікнуў: "Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых!"

Слаўнае нараджэньне тваё, прадвесьніку, ад няплоднае ацаліла зьнямоглую нашую прыроду і навучыла нас пяяць: "Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых!"

Нардзіўшыся ад няплоднае, ты, прадвесьніку, прадвясьціў прыйсьце ласкі для бясплоднага закону і ўсклікнуў Хрысту: "Блаславёны Ты, Божа айцоў нашых!"

*Багародзічны.* Дзева блаславёная, маліся за тых, што моляцца Табе: на Цябе спадзяемся ўсе і Цябе клічам. Дык не пагардзі, Уладарка, слугамі Тваімі.

**Песьня 8.** *Ірмас.* Ты, Збавіцелю ўсіх усясільны, зышоў сярод полымя, паслаў расу пабожным юнаком і навучыў іх пяяць: "Усе стварэньні Гасподнія, блаславіце Госпада!"

Заканадаўца Майсей быў слугою Старога, Ісус — Богам Новага Запавету; сёньня ж прадвесьнік як хадайнік абодвух запаветаў, пяе: "Усе стварэньні Госпаднія, блаславіце Госпада!"

З няплоднага ўлоньня галубка прыходзіць, і даецца Царкве Богу любая сьвятыня — Прадвесьнік Хрыстовы, які усклікае: "Усе стварэньні Госпаднія, блаславіце Госпада!"

Божыя людзі, народ сьвяты, упадобніцеся галубцы Хрыстовай і, жывучы ў чысьціні, засьпявайце суладна: "Усе стварэньні Госпаднія, блаславіце Госпада!"

*Траечны.* Патройным зьзяньнем асьветленыя, нястворанае адзінае Боства нязмоўкнымі вуснамі прававерна ўславім і запяём: "Усе стварэньні Госпаднія, блаславіце Госпада."

**Песьня 9.** *Ірмас.* Недасьледная Божая тайна ў Табе, чыстая Дзева, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе ў міласэрнасьці сваёй. Дзеля гэтага Цябе як Багародзіцу ўзьвялічваем.

Голас прадвесьніка заклікае няплодныя і пустыя сэрцы: "Рыхтуйце шлях Хрысту, які ідзе ў славе!" Дык будзем слухаць і ўзьвялічваць Яго.

Некалі, натхнёны Сьвятым Духам, ты, прадвесьніку, яўна прапаведаваў Сына-Ягнё Божае, што ўзяў на сябе грахі сьвету. Цяпер выпрасі статку твайму адпушчэньне грахоў.

*Траечны.* Уславім, верныя, трохлікую Еднасьць, Тройцу адзінасутную, што прасьвятляе нас Боскім дзеяньнем і напаўняе нашыя душы зьзяньнем незаходнага Сьвятла.

*Багародзічны.* Уладарка ўсяго тварэньня, даруй перамогу людзям Тваім, пакладзі пад ногі прававерных хрысьціянаў непакорлівага ворага, каб мы ўсе Цябе, Багародзіца, узьвялічвалі.

**Экзапастыляр.** *(тон 4).* Сёньня радаснае нараджэньне Прадвесьніка адмяняе сум бацькавай нематы і няплоднасьць маці і абвяшчае ісую радасьць. Дзеля гэтага ўсё стварэньне радасна сьвяткуе. (*Двойчы*)

Слава... цяпер...: Прарокі прадвяшчалі, апосталы прапаведавалі, мучанікі багамудрыя ясна вызнавалі, Багародзіца ўсячыстая, Сына Твайго як Бога ўсіх. З імі разам і мы, выбаўленыя Табою ад першаснага прысуду, узьвялічваем Цябе.

*(Тон 8).* Дзіўны цуд! Ад старой і няплоднай маці нарадзіўся сёньня прадвесьнік Бога-Слова Ян, і з ягоным нараджэньнем пачаў выразна прамаўляць нямы язык. Невыказны провід Твой, Уладару! Збаў ім душы нашы, Хрысьце, бо Ты адзіны міласэрны.

Вялікі цуд! Найбольшы сярод народжаных ад жанчыны прарок адмяняе сум матчынай няплоднасьці. Ён прыходзіць у Духу і сіле Ільлі зрабіць простымі сьцежкі Госпаду. Невыказная веліч Тваёй добрасардэчнасьці, Уладару! Дзеля яе, Хрысьце, збаў душы нашыя, бо Ты адзіны міласэрны.

Слаўны цуд! Той, хто прапаведаваў спусташэньне Хрыстовае дзеля людзей, першы паказвае Яго ўсім голасам сваім, адмяняе няплоднасьць маці сваёй сілаю Боскаю з вышыні і разьвязвае язык Захара. Вялікія цуды Твае, Уладару. Збаў імі тых, Хрысьце, што шануюць Твайго вялікага прадвесьніка.

Дзівосны цуд! Прарок і прадвесьнік, найбольшы сярод народжаных ад жанчыны і найвышэйшы сярод прарокаў, заварушыўся ва ўлоньні маці сваёй. Вялікія дары Твае, Чалавекалюбча! Збаў імі, Хрысьце ўсемагутны, душы нашыя.

Слава...

*(Тон 6).* Зорка сярод зорак, Богажаданы прадвесьнік Ян родзіцца сёньня ад няплоднае маці і аб'яўляе Зорку-Хрыста, Сьвітаньне з вышыняў і Пасху для ўсіх верных.

Цяпер...

Багародзіца, Ты — сапраўдная вінаградная лаза, што ўзрасьціла нам плод жыцьця. Просім Цябе, Уладарка: разам са сьвятымі апосталамі маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Пасьля Вялікага ўслаўленьня:** *трапар "Прарок і прадвесьнік прыйсьця Хрыстовага...", слава...цяпер..., "Тайна спрадвеку..." ( гл. с. 19) і звычайнае заканчэньне сьвяточнай ютрані.*

### ЛІТУРГІЯ

**Трапар** *(тон 4).* Прарок і прадвесьнік прыйсьця Хрыстовага, мы, што з любоўю шануем цябе, ня ведаем як усхваліць цябе дастойна: слаўнае нараджэньне тваё паклала канец няплоднасьці маці і бацькавай немаце і сталася пачаткам абвяшчэньня прыйсьця Сына Божага.

**Кандак** *(тон 3)*. Няплодная сёньня родзіць прадвесьніка Хрыстовага, які зьдзяйсьняе ўсе прароцтвы: усклаўшы ў Ярдане руку на Таго, каго прадказалі прарокі , ён паказаў сябе прарокам, прапаведнікам і прадвесьнікам Бога Слова.

**Пракімен** *(Пс 63:11,2)*. Праведнік узрадуецца ў Госпадзе і знойдзе прыпынак у Яго.

*Верш.* Госпадзе, пачуй голас малітвы маёй.

**Чытаньне лісту сьвятога апостала Паўла да Рымлянаў**

Браты, цяпер бліжэй да нас збаўленьне, як тады, калі мы ўверылі. Ноч мінула, дзень наблізіўся. Дык адкінем учынкі цемры і апра-немся ў зброю сьвятла. Будзем жыць прыстойна, як у ясны дзень: не ў гулянках і п'янстве, не ў распусьце і разбэшчанасьці, не ў сварках і зайздрасьці. Але апранецеся ў Госпада Ісуса Хрыста, і не клапоцьцеся пра цела ў дагаджэньні пажадлівасьцям. (14). А слабога ў веры прымайце прыхільна, бяз спрэчак аб поглядах. Адзін той думкі, што можна есьці ўсё, а другі, слабы, есьць толькі гародніну. Той, хто есьць усё, хай не пагарджае тым, хто ня есьць (усё), а той, хто ня есьць, хай не асуджае таго, хто есьць; бо Бог прыняў яго ласкава. Хто ты, што судзіш чужога слугу? Перад сваім Гаспадаром ён стаіць, або падае. І ўстаіць, бо ягоны Госпад моцны ўтрымаць яго на нагах. (*13:11-14:4*)

**Алілуя** *(Лк 1:68,76)*. Благаславёны Госпад, Бог Ізраіля, які наведаў і вызваліў народ свой.

*Верш.* І ты, дзіця, будзеш звацца прарокам Усявышняга.

**Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Лукі**

Як ужо многія ўзяліся складаць апавяданьне пра падзеі, што адбыліся між нас, як перадалі нам тыя, што былі непасрэднымі сьведкамі і слугамі Слова, наважыўся і я, дакладна дасьледаваўшы ўсё ад самога пачатку, апісаць па парадку табе, шаноўны Тэафілю, каб ты пераканаўся ў праўдзівасьці таго, чаго быў навучаны. Быў у дні Ірада, караля юдэйскага, сьвятар на імя Захар, з Авіевай чаргі набажэнстваў, а жонка ягоная была з дачок Ааронавых і называлася Альжбета. Былі яны абое справядлівыя перад Богам, жылі беззаганна і захоўваюлі ўсе Гасподнія запаветы і загады. Дый вось ня мелі яны дзіцяці, бо Альжбета была няплодная і абое былі ў гадох. І вось, калі ў парадку сваё чаргі ён адпраўляў службу паводле сьвятарскага звычаю перад Богам, яму выпала жэрабя ўвайсьці ў сьвятыню Гасподнюю кадзіць, а ўвесь народ маліўся знадворку ў час каджэньня. Раптам явіўся яму анёл Гасподні, які стаў з правага боку

кадзільнага ахвярніка. Убачыўшы яго, Захар сумеўся, і страх апанаваў яго. Але анёл сказаў яму: "Ня бойся, Захар, бо малітва твая была пачутая, і жонка твая Альжбета народзіць табе сына, якому дасі імя Ян. Будзе гэта для цябе радасьцю і вясельлем, і многія ўсьцешацца з ягонага нараджэньня. Бо ён будзе вялікі ў вачох Госпада, ня будзе піць ні віна, ні сікеры, і яшчэ ва ўлоньні маці сваёй напоўніцца Духам Сьвятым. Ён наверне многіх сыноў Ізраіля да Госпада, іхняга Бога; і пойдзе перад Ім у духу і сіле Ільлі, каб схіліць сэрцы бацькоў да дзяцей, непаслухмяных — да мудрасьці справядлівых, каб падрыхтаваць Госпаду народ дасканалы." Захар адказаў на гэта анёлу: "Па чым пазнаю ўсё гэта? Я ж стары, і жонка мая ў гадох." Анёл сказаў яму ў адказ: "Я — Габрыель, што стаю перад Богам. Я быў пасланы, каб гаварыць з табою і абʼявіць табе радасную вестку. І вось будзеш нямы і ня зможаш гаварыць да дня, калі ўсё гэта спраўдзіцца, бо ты не паверыў маім словам, якія споўняцца ў сваім часе." Тым часам народ чакаў Захара і дзівіўся, што ён надоўга затрымаўся ў сьвятыні. Калі ж выйшаў, ён ня мог гаварыць з імі, і яны зразумелі, што меў відзеньне ў сьвятыні. А ён рабіў ім знакі і заставаўся нямы. Калі ж скончыліся дні ягонага служэньня, ён вярнуўся ў свой дом. Пасьля гэтых дзён жонка ягоная, Альжбета, зачала і таілася пяць месяцаў, кажучы: "Так мне ўчыніў Госпад, калі глянуў ласкава і зьняў з мяне ганьбу сярод людзей."

Тым часам надышоў час Альжбеце радзіць, і яна нарадзіла сына. Калі ейныя суседзі і сваякі пачулі, што Бог явіў ёй вялікую міласэрнасьць, яны ўсьцешыліся разам з ёю. На восьмы дзень яны прыйшлі, каб абрэзаць дзіця, і хацелі даць яму імя ягонага бацькі — Захар. Але маці ягоная сказала: "Не, ён будзе называцца Янам." Ёй адказалі: "Ніхто ў тваім родзе ня мае гэтага імя." Тады спыталіся знакамі ў бацькі ягонага, як бы хацеў яго назваць. А ён папрасіў таблічку і напісаў: "Імя яму — Ян." І ўсе зьдзівіліся. І адразу адчыніліся ягоныя вусны і разьвязаўся язык, і ён загаварыў, блаславіўляючы Госпада. І страх ахапіў усіх суседзяў іхніх, і расказвалі пра ўсё гэта па ўсёй горнай краіне Юдэйскай. Усе, што чулі, бралі сабе гэта да сэрца і пыталіся: "Кім будзе гэтае дзіцятка?" Бо сапраўды рука Гасподняя была на ім. А Захар, бацька ягоны, напоўніўся Духам Сьвятым і прарочыў, кажучы: "Благаслаўлёны Госпад, Бог Ізраіля, які наведаў і вызваліў народ свой. І ты, дзіцятка, будзеш звацца прарокам Усявышняга, бо пойдзеш перад Госпадам, каб падрыхтаваць сьцежкі Яму." А хлопчык рос і ўмацоўваўся духам, і жыў у пустых мясьцінах аж да дня свайго зьяўленьня перад Ізраілем. (*1:1-25,57-68,76,80*)

**Прычасьнік** *(Пс 111:6-7)*. Памяць праведніка жыць будзе вечна, благое весткі ён не збаіцца. Алілуя, алілуя, алілуя.

## 25 чэрвеня

## Сьвятое мучаніцы Хаўроньні

### ВЯЧЭРНЯ

(*24 чэрвеня ўвечары*)

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*): Ян сваім нараджэньнем... Сёньня Голас Слова разьвязвае бацькавы язык... Перш як Бог-Слова нарадзіўся ад Дзевы... (*Гл. с. 14*)

*Мучаніцы (тон 4).* У змаганьні тваім ты, усяхвальная Хаўроньня, пацярпела падвойна, калі зьмяшала пот устрыманасьці з крывёю мучэньняў. Таму падвойны вянец даў табе Дабрачынца, да якога ты ўзышла, поўная сьветласьці, як дзева беззаганная і неперанможная мучаніца.

Прыгажосьць цела і краса боскае душы тваёй злучыліся ў табе, і ты зацьвіла быццам лілея ў сяленьнях сьвятых, зьзяючы сьветласьцю і чырваньню крыві тваёй, нявеста беззаганная. Дзеля гэтага неразбуральны нябесны хорам прыняў цябе як дзеву і мучаніцу.

Побач з табою, Хаўроньня ўсяхвальная, быў заўсёды анёл, які ахоўваў цябе. Ад дзяцінства ты жыла ў страху Гасподнім, і прынесла сябе як пачэсную ахвяру, захаваўшы сябе чыстаю для Ўсемагутнага. Дзеля гэтага ты патаптала Сэлінаву неразумнасьць і узьнялася да Хрыста, жаніха твайго.

Слава... цяпер...

Гляньма на Альжбету, якая кажа Дзеве Марыі... (*Гл. с. 18*)

**Вершапесьні**: *актойху.*

Слава... цяпер...

Альжбета зачала... (*Гл. с. 15*)

**Адпушчальныя трапары**

***Трапар Хрысьціцеля (тон 4).*** Прарок і прадвесьнік прыйсьця Хрыстовага, мы, што з любоўю шануем цябе, ня ведаем як усхваліць цябе дастойна: слаўнае нараджэньне тваё паклала канец няплоднасьці маці і бацькавай немаце і сталася пачаткам абвяшчэньня прыйсьця Сына Божага.

Слава..

***Мучаніцы*** *(Тон 4).* Ягнё Тваё, Ісусе, Хаўроньня, кліча моцным голасам: "Цябе, Жаніх мой, люблю і, Цябе шукаючы, мукі пера-нашу, і расьпінаюся з Табою, і пахаваньне прымаю ў хрышчэньні Тваім, і цярплю за Цябе, каб панаваць з Табою, і паміраю за Цябе, каб з Табою жыць; Ты ж прымі мяне як ахвяру чыстую, што з любоўю прыносіцца Табе." Малітвамі яе, Міласэрны, збаў душы нашыя.

Цяпер...

*Багародзічны або Крыжабагародзічны дня 4 тону.*

**29 чэрвеня**

# СЬВЯТЫХ СЛАЎНЫХ І ГОДНЫХ ПАХВАЛЫ АПОСТАЛАЎ ПЯТРА І ПАЎЛА

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."** *наступныя песьні, паўтараючы кожную:*

*(Тон 2).* Якімі пахвальнымі вянкамі ўшануем Пятра і Паўла, разьдзеленых целам і зьяднаных духам, першых сярод богаправеднікаў: аднаго, як старшыню апосталаў, другога, як таго, што больш за іншых працаваў. Іх сапраўды дастойна вянчае несьмяротнай славаю Хрыстос Бог у вялікай міласэрнасьці сваёй.

Якімі велічнымі песьнямі ўславім Пятра і Паўла — богаразумныя крылы, што ўвесь сьвет абляцелі і да неба ўзьняліся; рукі ласкі евангельскай, ногі праўдзівага прапаведаваньня, рэкі мудрасьці; два плячы крыжа, якімі дэманаў перамог Хрыстос Бог у вялікай міласэрнасьці сваёй.

Якімі духоўнымі песьнямі ўсхвалім Пятра і Паўла, што замкнулі крыклівыя вусны нязбожных? Яны — грозныя мячы духоўныя, краса Рыму сьвятога, карміцелі сусьветныя, боганатхнёныя табліцы Новага Запавету, што Хрыстос устанавіў у Сыёне ў вялікай міласэрнасьці сваёй.

Слава...

*(Тон 4).* Патройным запытаньнем: "Пётра, ці любіш Мяне?", Хрыстос паправіў патройнае Пятрова адрачэньне. Сымон усклікнуў Таму, хто бачыць таямніцы сэрцаў: "Госпадзе, Ты ўсё ведаеш. Ты ведаеш, што люблю Цябе!"Тады Збавіцель яму ў адказ: "Пасі авечак маіх, пасі выбраных маіх, пасі ягнят маіх, якіх я падрыхтаваў для збаўленьня." Дзеля гэтага, блаславёны апостале Божы, малі Яго цяпер, каб Ён дараваў нам багацьце свайго зьмілаваньня.

Цяпер ...

*Дагматык (тон 4).* Прарок Давід, які праз Цабе стаўся богаайцом, у песьні Таму, хто вялікія рэчы для Цябе ўчыніў, так пра Цябе прадказаў: "Каралева стала па правай руцэ Тваёй." Ён явіў Цябе, як хадайніцу і Маці Жыцьця, бо ад Цябе захацеў прыняць цела і стацца чалавекам Хрыстос Бог, каб аднавіць сатлелы прагнасьцю вобраз свой і знайсьці заблудную ў горных безданях авечку, каб, узяўшы яе на плечы, прынесьці да Айца і даць ёй месца разам з

нябеснымі сіламі, і збавіць, Багародзіца, сьвет у велічы і багацьці міласэрнасьці сваёй.

**Чытаньне першага лісту Сьвятога Апостала Пятра**

Браты, хай будзе блаславёны Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста. Ён, у вялікай міласэрнасьці сваёй, праз уваскрасеньне з мёртвых Ісуса Хрыста нанова нарадзіў нас да жывой надзеі, да спадчыны незьнішчальнай і чыстай, што ніколі не завяне, якая прызначаная для нас у небе. Сілаю Божаю праз веру вы ахаваныя для збаўленьня, якое мае аб'явіцца ў апошні час. Дзеля гэтага цешцеся, хоць цяпер вам і прыходзіцца зазнаць суму ад розных выпрабаваньняў. Праз гэта вартасьць веры вашай станецца больш каштоўнай за золата — якое, хоць і выпрабоўваецца агнём, але падуладнае зьнішчэньню, — на славу і хвалу ў аб'яўленьні Ісуса Хрыста. Вы, ня бачыўшы, любіце Яго; і верыце ў Яго, хоць ня бачыце, а будзеце цешыцца радасьцю вялікай і поўнай хвалы, калі асягнеце мэту вашай веры — збаўленьне душаў. *(1:3-9)*

**Чытаньне першага лісту Сьвятога Апостала Пятра**

Мілыя мае, падперазаўшы паясьніцы розуму вашага, будзьце цьвярозымі, мейце дасканалую надзею на ласку, якая будзе вашым удзелам у аб'яўленьні Ісуса Хрыста. Як паслухмяныя дзеткі, не кіруйцеся вашымі ранейшымі пажаданьнямі, калі вы былі яшчэ несьвядомымі, але усімі вашымі паводзінамі станьцеся сьвятымі на прыклад Сьвятога, які вас паклікаў; бо напісана: "Будзьце сьвятымі, бо Я сьвяты." Бо калі вы называеце Айцом Таго, хто судзіць кожнага паводле ўчынкаў ягоных і не ўзіраецца на аблічча, дык у страху праводзьце час ваш тут на чужыне. Вы ведаеце, што вы былі выкупленыя ад вашых благіх звычаяў, атрыманых у спадчыну ад продкаў вашых, не недаўгавечным срэбрм ці золатам, але шматкаштоўнаю крывёю Хрыста, быццам беззаганнага і чыстага Ягняці. *(1:13-19)*

**Чытаньне першага лісту Сьвятога Апостала Пятра**

Мілыя мае, прашу вас, як падарожнікаў і прыхадняў, каб вы ўстрымліваліся ад цялесных пажаданьняў, што супраць душы ваююць. Хай ваш спосаб жыцьця сярод паганаў будзе добрым, каб яны бачылі вашыя ўчынкі і славілі Бога ў дзень наведаньня за тое, за што цяпер вас ачарняюць як злачынцаў. Будзьце паслухмянымі кожнаму людзкому начальству з увагі на Госпада: ці то каралю, які мае ўладу, ці намесьніку ягонаму, пасланаму, каб караць злачынцаў і ахоўваць тых, што робяць добра. Бо такая ёсьць воля Божая, каб вы рабілі добрыя ўчынкі і тым затыкалі вусны нявуцтву неразумных. Захоўвайцеся як людзі свабодныя

— не як тыя, для якіх свабода служыць для апраўданьня зла, але як слугі Божыя. Шануйце ўсіх, любеце братоў, бойцеся Бога, караля паважайце. Слугі, са страхам слухайце гаспадароў, ня толькі добрых і лагодных, але таксама суровых. Бо прыемна Богу, калі нехта, з увагі на сумленьне, падлеглае Богу, пераносіць гора, церпячы несправядліва. Бо якая вам хвала, калі вас караюць за грахі вашыя? Але Богу падабаецца, калі вы, робячы добра, пераносіце цярпеньні: да гэтага ж вы пакліканыя. Хрыстос таксама пацярпеў за вас і пакінуў вам прыклад, каб вы ішлі сьледам за Ім. "Ён не ўчыніў ніякага граху, і ў вуснах Яго не было подступу." Ён, калі Яго зьнеważалі, не зьневажаў узаемна, калі цярпеў, не пагражаў, але перадаў Таму, хто чыніць справядлівы суд. Ён сам, у сваім целе, узьнёс нашыя грахі на дрэва, каб мы перас-талі быць удзельнікамі граху, а жылі для справядлівасьці. Ранамі Ягонымі вы аздароўленыя. *(2:11-24)*

**Ліцьця**

*(Тон 2).* Зьбярыцеся сёньня, хоры верных, каб у сьвяточнай грамадзе ўславіць абраных слугаў ласкі Пятра і Паўла. Ушануем іх належнай хвалою, бо яны шчодра сеялі слова і ўзбагачалі ўсіх ласкаю Духа. Галінкі праўдзівага вінаграднага куста, яны ўзрасьцілі гронку сьпелую на радасьць сэрцам нашым. Дык з адкрытым тварам і чыстым сумленьнем усклікнем: "Радуйцеся, зьнішчальнікі бяздум'я і слугі духоўнасьці."

Усхвалім сёньня апосталаў Пятра і Паўла, вучняў Хрыстовых, непахісныя асновы, стаўпы і сьцены Царквы, боскія трубы навукі і мукаў Хрыстовых, усяго сьвету хадайнікаў. Яны абышлі ўсю зямлю і заарралі яе, пасеялі веру і насадзілі для ўсіх богапазнаньне навукаю аб Тройцы. Пётра, камень і аснова, і Павал, абраны посуд! Вы хадзілі ў адным ярме Хрыстовым і ўсіх — народы, гарады і астравы, — да богапазнаньня прывялі, гэбрэяў зноў навярнулі да Хрыста, а цяпер моліцеся за збаўленьне душаў нашых.

Пётра, найвышэйшы сярод слаўных апосталаў, камень веры, і Павал знакаміты, сьвятых цэркваў настаўнік і сьветач! Перад пасадам Божым маліцеся Хрысту за нас.

Павал — вусны гасподнія, аснова вучэньня! Некалі ты пера-сьледаваў Ісуса Спаса, а пасьля стаўся першым сярод апосталаў. Узьнесены да трэцяга неба, ты бачыў невыказныя рэчы і клікаў усіх: Хадзіце са мною і ня будзеце пазбаўленыя дабротаў.

*(Тон 3).* Нябеснага Ерусаліму жыхары, камені веры, дабравесьнікі Царквы Хрыстовае, пасланцы Тройцы, сьвету лаўцы пакі-

нулі ўсё зямное, праз мучэньні да Бога прыйшлі і сьмела моляцца за збаўленьне душаў нашых.

Слава...

*(Тон 5).* Мудрасьць Божая, спрадвечнае Слова Айца, праўдзіва ў евангельлях прадвясьціла аб вас, усяхвальныя апосталы, што вы — шматплодныя вінаградныя лозы, якія на галінках сваіх узрасьцілі гронкі сьпелыя і сочныя на радасьць і асалоду верным, што іх спажываюць. Пётра, камень веры, і Павал, хвала сусьветная! Умацуйце статак, які вы прыдбалі вашым вучэньнем.

Цяпер...

(*Тон 5*). Бласлаўляем Цябе, Багародзіца Дзева, мы, верныя, і дастойна славім Цябе, як непахісную Сьцяну, надзейную Заступніцу і Прыстанішча душаў нашых.

**Вершапесьні**

*(Тон 1).* Слаўны апостал Павал! Хто можа апісаць тваё вязьніцы і перасьледаваньні па ўсіх гарадох, расказаць пра тваё цяжкасьці і нястачы, голад, смагу і холад, пабоі палкамі, якія табе прыйшлося цярпець, жыцьцё ў пустыні, караблекрушэньні і каменяваньні? Ты быў відовішчам для анёлаў і людзей, і ўсё гэта перацярпеў дзеля Хрыста, які ўмацоваў цябе, каб ты мог сьвет здабыць для Госпада твайго. Дзеля гэтага, шануем памяць тваю і з верою просім цябе няспынна маліцца за душы нашыя.

*Верш.* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

Хто, слаўны апостале Паўле, можа апісаць тваё вязьніцы і перасьледаваньні ва ўсіх гарадох? Або хто дастойна раскажа пра тваё подзьвігі і высілкі дзеля евангельля, каб усіх здабыць і прывесьці Царкву да Хрыста? Прасі, цэркваў настаўнік, каб яна захавала да канца добрае вызнаньне тваё.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

Усхвалім вялікіх сьветачаў Царквы Пятра і Паўла, што на небасхіле веры зазьзялі ясьней за сонца і народы сьвятлом прапаведаваньня вывелі з цемры няведаньня. Першы з іх, на крыжы расьпяты, перасяліўся да неба, дзе атрымаў ад Хрыста ключы валадарства; другі быў забіты мячом і занесены да Збавіцеля, дзе атрымаў дастойную заплату. Абодва яны абвяшчалі сьмела Ізраілю, які на самога Госпада неправедна рукі ўзьняў. Дзеля

гэтага малітвамі іх, Хрысьце Божа наш, праціўнікаў Царквы адхілі і веру праўдзівую ўмацуй у чалавекалюбстве Тваім.

Слава ...

*(Тон 6).* Радасная ўрачыстасьць зазьзяла сёньня на ўвесь сьвет, пачэсная памяць мудрых Пятра і Паўла, першых сярод апосталаў. Рым радуецца, сьвяткуе і ў песьнях славіць іх; сьвяткуйма ж і мы, браты, і ўшануйма гэты сьветлы дзень. Усклікнем: "Радуйся, Пётра апостале, шчыры прыяцель Настаўніка твайго, Хрыста Бога нашага! Радуйся, Павал любы, прапаведнік веры і сусьветны настаўнік! Выбраная сьвятая пара, што мае моц вялікую, малі Хрыста Бога нашага за збаўленьне душаў нашых."

Цяпер...

*(Тон 6).* Творца і Збавіцель мой, Усячыстая, Госпад Ісус Хрыстос, выйшаўшы з Твайго ўлоньня, у мяне апрануўся і ад першага Адамавага праклёну вызваліў мяне. Дзеля гэтага Табе, Багародзіца, Маці Божая і Дзева, разам з анёламі нязмоўкна ўсклікаем: "Радуйся!" Радуйся, Уладарка, Заступніца, Абарона і Збаўленьне душаў нашых!

**Адпушчальныя трапары**

***Апосталам** (тон 4).* Першыя сярод апосталаў і сусьветныя настаўнікі, Уладара ўсіх маліце, каб Ён дараваў супакой усяму сьвету і душам нашым багацьце свайго зьмілаваньня. (*Двойчы*)

***Багародзіцы.*** Багародзіца Дзева, радуйся, поўная ласкі Марыя, Госпад з Табою; блаславёная Ты між жанчынаў і блаславёны плод улоньня Твайго, бо Ты нарадзіла Збавіцеля душ нашых.

## ЮТРАНЬ

**Пасьля "Госпад — Бог...":**

***Трапар*** : Першыя сярод апосталаў... (*Двойчы*)

Слава... цяпер...

***Багародзічны** (тон 4).* Тайна, спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая, праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, якім уваскрасіў першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

гэтага малітвамі іх, Хрысьце Божа наш, праціўнікаў Царквы адхілі і веру праўдзівую ўмацуй у чалавекалюбстве Тваім.

Слава ...

*(Тон 6).* Радасная ўрачыстасьць зазьзяла сёньня на ўвесь сьвет, пачэсная памяць мудрых Пятра і Паўла, першых сярод апосталаў. Рым радуецца, сьвяткуе і ў песьнях славіць іх; сьвяткуйма ж і мы, браты, і ўшануйма гэты сьветлы дзень. Усклікнем: "Радуйся, Пётра апостале, шчыры прыяцель Настаўніка твайго, Хрыста Бога нашага! Радуйся, Павал любы, прапаведнік веры і сусьветны настаўнік! Выбраная сьвятая пара, што мае моц вялікую, малі Хрыста Бога нашага за збаўленьне душаў нашых."

Цяпер...

*(Тон 6).* Творца і Збавіцель мой, Усячыстая, Госпад Ісус Хрыстос, выйшаўшы з Твайго ўлоньня, у мяне апрануўся і ад першага Адамавага праклёну вызваліў мяне. Дзеля гэтага Табе, Багародзіца, Маці Божая і Дзева, разам з анёламі нязмоўкна ўсклікаем: "Радуйся!" Радуйся, Уладарка, Заступніца, Абарона і Збаўленьне душаў нашых!

**Адпушчальныя трапары**

***Апосталам (тон 4).*** Першыя сярод апосталаў і сусьветныя настаўнікі, Уладара ўсіх маліце, каб Ён дараваў супакой усяму сьвету і душам нашым багацьце свайго зьмілаваньня. (*Двойчы*)

***Багародзіцы.*** Багародзіца Дзева, радуйся, поўная ласкі Марыя, Госпад з Табою; блаславёная Ты між жанчынаў і блаславёны плод улоньня Твайго, бо Ты нарадзіла Збавіцеля душ нашых.

## ЮТРАНЬ

**Пасьля "Госпад — Бог...":**

***Трапар*** : Першыя сярод апосталаў... (*Двойчы*)

Слава... цяпер...

***Багародзічны (тон 4).*** Тайна, спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая, праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, якім уваскрасіў першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

**Першая сядальная песьня** *(тон 8).* Ты пакінуў лоўлю рыбаў, атрымаў з неба ад Айца Боскае адкрыцьцё ўцелаўленьня Слова і сьмела ўсклікнуў з верою Творцу твайму: "Ведаю Цябе, як адзінасутнага Сына Божага." Дзеля гэтага ты, Пётра апостале, дастойна завешся каменем веры і ключаром ласкі. Малі Хрыста Бога даць адпушчэньне грахоў тым, што спраўляюць з любоўю светлую памяць тваю.

Слава...: *(Тон 1).* Царкоўны камень, Пятра ўсяхвальнага, і змагара за веру Паўла, сусьветную сецць, дастойна ўсхвалім, верныя, як тых, што маюць ключы нябесныя. Ад іх прасьвятліўся ўвесь сусьвет верою ў Тройцу. Слава Таму, хто ўславіў вас; слава Таму, хто ўмацаваў вас; слава Таму, хто дае праз вас жыцьцё вечнае.

Цяпер.....: *(Тон 1).* Усесьвятая Дзева, уздымі рукі Твае, — што некалі насілі Творцу, які ў дабрыні сваёй стаўся чалавекам, — і малі Сына Твайго захаваць ад спакусы, страсьцяў і небясьпекі ўсіх тых, што з любоўю славяць Цябе і клічуць: "Слава Таму, хто пасяліўся ў Табе; слава таму, хто выйшаў з Цябе; слава Таму, хто вызваліў нас нараджэньнем Тваім!"

**Другая сядальная песьня** *(тон 8).* Ты атрымаў ад Хрыста пакліканьне з неба, быў прапаведнікам усяму сьвету і ўсіх прасьвятліў ласкаю навукі тваёй; выкараніўшы няволю пісанага закону, ты прынёс верным сьвятло пазнаньня Духа. Дзеля гэтага ты, Паўле апостале, быў дастойна ўзьняты да трэцяга неба і дасягнуў раю. Малі цяпер Хрыста Бога даць адпушчэньне грахоў тым, што з любоўю спраўляюць сьвятую памяць тваю.

Слава...: *(Тон 4).* Быццам зоркі, што асьвятляюць усю зямлю промнямі сваімі, так і вы прасьвятляеце ўсіх вашым прапаведаваньнем, удзельнікі нябесных тайніцаў і апосталы Гасподнія.

Цяпер...: *(Тон 4).* Надзейную Заступніцу тых, што ў бедах, нашую Памочніцу і Хадайніцу перад Богам, праз якую мы вызваліліся ад тленнасьці, Багародзіцу верна ўславім.

**Паліелей.** Хваліце імя Госпадняе...

**Узьвялічваньне.** Узьвялічваем вас, апосталы Хрыстовыя, што ўвесь сьвет прасьвятляеце навукаю вашаю, і ўсіх да Хрыста прыводзіце.

*Верш 1.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

*Верш 2.* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

*Верш 3.* Ад усходу сонца да захаду хай будзе праслаўленае імя Гасподняе.

*Верш 4.* Госпад сілу людзям сваім дае, Госпад благаслаўляе людзей сваіх супакоем.

Слава... цяпер...

Алілуя, алілуя, алілуя. Слава Табе, Божа. (*Тройчы*)

**Сядальная песьня** *(тон 8).* Усхвалім Пятра і мудрага Паўла, найвышэйшых вучняў і вялікія сьветчы. Загарэўшыся агнём Боскага Духа, яны разьвеялі туман маны, стаўшыся воямі нябеснага валадарства і саўдзельнікамі Пасаду ласкі. Дзеля гэтага радасна ўсклікаем: "Апосталы Хрыста Бога, выпрасіце адпушчэньне грахоў для тых, што з любоўю сьвяткуюць вашую памяць." (*Двойчы*)

Слава ... цяпер...

*(Тон 8).* Як беззаганная Нявеста Творцы, Маці Збавіцеля, што мужа ня знала, усяхвальная скарбніца Пацяшыцеля, спяшайся вызваліць мяне, агіднае жыльлё беззаконьня, чый розум стаўся пацехаю бесаў, і ўчыні мяне сьветлым жыльлём дабрадзейнасьцяў і нятленных багацьцяў. Малітвамі Тваімі адгані ад мяне хмару пажадлівасьцяў і ўчыні дастойным удзельнікам вышэйшага жыцьця і незаходнага сьвятла.

**Узыходная песьня:** *першы антыфан 4 тону.*

**Пракімен.** Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

### Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Яна

У той час зьявіўся Ісус вучням сваім, уваскросшы з мёртвых, і кажа Сымону Пятру: "Сымоне, сыне Ёны, ці любіш Мяне больш, чым яны?" Адказаў Яму: "Так, Госпадзе, Ты ведаеш, што люблю Цябе." Кажа яму: "Пасі ягнятаў Маіх." Зноў кажа яму другі раз: "Сымоне, сыне Ёны, ці любіш мяне?" Кажа Яму: "Так, Госпадзе, Ты ведаеш, што люблю Цябе." Кажа яму: "Пасі авечак Маіх." Кажа яму трэці раз: "Сымоне, сыне Ёны, ці любіш ты Мяне?" Засумаваў Пётра, што Ён сказаў яму трэці раз: "Ці любіш Мяне?." І сказаў Яму: "Госпадзе, Ты ўсё ведаеш, Ты ведаеш, што люблю Цябе." Кажа яму Ісус: "Пасі авечак Маіх. Сапраўды, сапраўды кажу табе: калі ты быў маладзейшы, дык падпярэзваўся сам і ішоў, куды хацеў; калі ж пастарэеш, працягнеш твае рукі, і іншы падпярэжа цябе і павядзе, куды ня хочаш." Гэта Ён сказаў, даючы зразумець, якой сьмерцю ён

праславіць Бога. І, сказаўшы гэта, кажа яму: "Ідзі сьледам за Мною." Павярнуўшыся, Пётра ўбачыў, што за ім ідзе вучань, якога любіў Хрыстос, той самы, які на вячэры прыпаў да Ягоных грудзей і сказаў: "Госпадзе, хто прадасьць Цябе?" Дык, угледзеўшы яго, Пётра кажа Ісусу: "Госпадзе, а ён што?" Кажа яму Ісус: "Калі я хачу, каб ён застаўся, пакуль Я прыйду, што табе да гэтага? Ты ідзі за Мною." І разышлося гэтае слова сярод братоў, што вучань гэты не памрэ. Але Ісус не сказаў яму, што не памрэ, але: "Калі хачу, каб ён заставаўся, пакуль прыйду, што табе да гэтага?." Гэта і ёсьць той вучань, які сьведчыць пра гэта і напісаў гэта. І мы ведаем, што сьведчаньне ягонае праўдзівае. Ёсьць шмат іншага, што зрабіў Ісус: калі б пра ўсё гэта напісаць, дык думаю, што і ўвесь сьвет не зьмясьціў бы гэтых напісаных кнігаў. *(21:15-25)*

**Псалом 50.** *Пасьля:*

Слава...: Малітвамі апосталаў, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Цяпер...: Малітвамі Багародзіцы, Міласэрны, ачысьці мноства правінаў нашых.

Зьмілуйся нада мною, Божа...: *(Тон 6).* Прапаведнікаў праўдзівай набожнасьці і сьветлыя зоркі царкоўныя, — Пятра, каменя веры і Паўла, вялікага настаўніка і тайніка Хрыстовага, — ўсхвалім у песьнях. Яны пасеялі слова праўды ў сэрцах верных і зрабілі іх пладавітымі, і моляць Хрыста Бога за збаўленьне душаў нашых.

### Каноны

**Песьня 1**

***Канон 1: Пятра*** *(тон 4). Ірмас.* Няма падобнага да Цябе, усяслаўны Госпадзе, бо Ты моцнай рукою выбавіў людзей, якіх Ты прыдбаў для сябе,Чалавекалюбча.

*Прыпеў.* Сьвяты апостале Пётра, малі Бога за нас.

Найвышэйшага і першага Хрыстом пакліканага апостала боганатхнёнымі песьнямі сёньня ўсхвалім.

Спрадвечны Бог ад пачатку выбраў цябе, блаславёны Пётра, на першапасаднага ў сваёй Царкве.

Ня цела і кроў, але сам Айцец натхніў цябе, Пётра, вызнаць Хрыста як сапраўднага Сына Ўсявышняга Бога.

*Багародзічны.* Гару сьвятую, Носьбітку Найвышэйшага, Маці Божую, што пасьля родаў засталася Дзеваю, усхвалім.

***Канон 2: Паўла** (тон 8). Ірмас.* Неразьдзельнае разьдзялілася, сонца ўбачыла зямлю, якой ня бачыла, вада затапіла лютага ворага, а Ізраіль прайшоў непраходную бездань, пяючы: "Пяём Госпаду, бо Ён уславіўся."

*Прыпеў.* Сьвяты апостале Паўле, малі Бога за нас.

Той, для каго наша сутнае зьяўляецца нясутным, Хрыстос, сваім Боскім розумам выбраў цябе, блаславёны Паўле, ад матчынага ўлоньня несьці ўсім народам Боскае Ягонае імя, вышэйшае за кожнае імя, бо Ён уславіўся.

З абвяшчэньнем будучага зьзяньня набожнасьці і ачышчэньня ад маны, Хрыстос зьявіўся табе, Паўле, як маланка, і асьляпіў вочы цялесныя, а душэўным даў разумненьне Тройцы, бо Ён уславіўся.

Ты, Павал, — з семя гэбрэйскага, з калена Бэніямінавага, абрэзаны на восьмы дзень, руплівец паданьняў айцоў, паводле закону фарысэй. Усё гэта ты палічыў за нішто дзеля Хрыста, які ўславіўся.

*Багародзічны.* Чыстая Маці Бога Ўсемагутнага, парастак з каралеўскага роду, Ты — Адзіная, што звышпрыродна нарадзіла ў целе Бога і Ўладара ўсіх. Збаў, Уладарка, ад бедаў мяне, каб я мог пяяць Сыну Твайму, бо Ён уславіўся.

*Катавасія.* Адчыню вусны мае... *(гл. с. 48)*

**Песьня 3**

***Канон 1** (тон 4). Ірмас.* Ня мудрасьцю і сілаю і не багацьцем хвалімся, але Табою, Хрысьце, Мудрасьць Айца. Ніхто не сьвяты, апроч Цябе, Чалавекалюбча.

Салодкія вусны Хрыста Бога назвалі цябе шчасьлівым і непахіснай скарбніцай валадарства. Дзеля гэтага славім цябе, Пётра апостале.

На непахісным камені твайго багаслоўя Ісус Уладар заснаваў Царкву сваю, у якой мы цябе, Пётра апостале, славім.

Пётра, хоць і ў целе, — вышэйшы за анёлаў, бо ў сьветлае прыйсьце Хрыста Бога ён будзе сядзець разам з Ім на судовым пасадзе.

*Багародзічны.* Ты, што без мужа нарадзіла Бога ў целе, умацуй мяне, апанаванага напасьцямі пажадлівасьцяў, бо ня маю іншай памочніцы апроч Цябе.

***Канон 2** (тон 8). Ірмас.* Ты, Госпадзе — умацаваньне тых, што прыбягаюць да Цябе, Ты — сьвятло для тых, што ў змроку. Дзеля гэтага дух мой славіць Цябе.

Ты — непахісны вуглавы камень, закладзены Збавіцелем і Госпадам для ўмацаваньня душаў верных.

Павал блаславёны, маліся, каб на тваёй аснове збудаваць мне сьветлы хорам дабрадзейнасьцяў.

Ты, Паўле, насіў у целе тваім мёртвасьць Хрыста і ўдастоіўся сапараўднага жыцьця.

*Багародзічны.* Мы, хрысьціяне, маем Цябе за нашую ахову і прытулак, і славім Цябе няспынна, Дзева Маці.

**Гіпакоі.** *(Тон 8).* Якая вязьніца не трымала цябе? Якая царква ня мела цябе сваім настаўнікам? Дамаск гаворыць пра цябе, Паўле, бо ён ведае цябе як асьлепленага сьвятлом з вышыні; Рым кроў тваю прыняў і ёю хваліцца; дый і Тарсіс радуецца, шануючы твае пялёнкі. Пётра, каменю веры, Паўле, пахвала сусьветная, прыйшоўшы з Рыму, умацуйце нас.

**Песьня 4**

***Канон 1** (тон 4). Ірмас.* Вось Бог наш, які прыняў цела ад Дзевы і абагавіў нашу прыроду. Яго мы славім у песьнях, усклікаючы: "Слава сіле Тваёй, Госпадзе."

Хрыстос, як абяцаў, зрабіў цябе рыбаком людзей і, асьвяціўшы, даручыў табе першаму стырно Царквы сваей.

Хай Жыцьцядаўца Хрыстос, які даў табе, Пётра, уладу вязаць і разьвязваць, тваімі малітвамі будзе міласэрны для мяне.

Маліся няспынна, Пётра, каб валадарства Хрыстовае было адчыненае для тых, што з вераю шануюць памяць тваю.

*Багародзічны.* Усяхвальная Ўладарка Багародзіца, Маці Бог ўсіх, Тваімі малітвамі ачысьці мае думкі і дай, каб я прынё багатыя плады дабрадзейнасьцяў.

*Канон 2 (тон 8). Ірмас.* Ты сеў на апосталаў Тваіх, Госпадзе, быццам на коняў, трымаючы ў руках іхнія вузды. І язда Твая была збаўлень-нем для тых, што з вераю клічуць: "Слава сіле Тваёй, Госпадзе!"

Некалі Саул, быццам раз'ятраны леў, бегаў, жадаючы зьнішчыць Царкву Хрыстовую; але быў злоўлены Боскім голасам Ягняці, якога ён перасьледаваў. І Той даручыў яму, як пастыру, свой статак.

Той, хто меў стацца сьвятлом сьвету, сьлепне. Праз Ананьню, які быў пасланы да яго, ён атрымлівае прасьвятленьне духоўнае і цялеснае. Бог, зьявіўшыся, учыніў яго сваім выбраным посудам.

Дамаск п'е ўдосталь навуку Паўлаву. З яго, як некалі з раю, пацякла крыніца Боскіх водаў, што напаўняе пазнаньнем Бога ўсю зямлю.

*Багародзічны.* Госпад зьвёў долу моцных з іхніх пасадаў, як сказала Дзева і Маці, і напоўніў Боскімі дабротамі ўбогіх, якія з вераю клікалі:" Слава сіле Тваёй, Госпадзе!"

**Песьня 5**

*Канон 1 (тон 4). Ірмас.* Набыўшы нас, выбраны Твой народ, Тваёй крывёю, дай нам, Госпадзе, Твой супакой і захавай у згодзе і аднадумстве статак Твой.

Вялікая любоў твая, апостале Пётра, давала табе сьмеласьць у прысутнасьці Бога. Нявучаны рыбак, дзеля слаўных цудаў, якія ты ласкаю чыніў, ты справядліва стаўся прадметам подзіву для ўсіх.

Ня золата і срэбра, але дабрадзейнасьці набыў сабе дзеля Цябе боскі апостал Твой, Хрысьце, і ўзбагаціўся сілаю чыніць цуды.

Словам тваім, апостале Пётра, ты аздараўляў ногі кульгавых. Ты ўсё чыніў ласкаю і сілаю Боскага Духа.

*Багародзічны.* Бог прыняў цела ад Цябе, Усячыстая, і стаўся чалавекам, застаўшыся па Боскай прыродзе нязьменным Духам.

*Канон 2 (тон 8). Ірмас.* Прасьвятлі нас запаветамі Тваімі, чалавекалюбны Госпадзе, і сілаю Тваёю дай нам Твой супакой.

Ты, Паўле, выбраў сабе сапраўдную пахвалу, бо насіў заўжды ў сабе, як знак перамогі, Крыж Уладара Хрыста.

Для цябе, Паўле слаўны, Хрыстос быў жыцьцём, а сьмерць — набыткам. Ты любоўю ўкрыжаваў сябе дзеля Таго, хто быў укрыжаваны дзеля нас.

Ты, пачэсны Паўле, радуешся сёньня ў Госпадзе, бо, калі ты пакінуў цела, ты адышоў да Хрыста Бога і Жыцьцядаўца.

*Багародзічны.* Малі няспынна Сына Твайго і Бога нашага, Марыя Дзева Чыстая, каб Ён паслаў нам, верным, міласьць сваю.

**Песьня 6**

***Канон 1*** *(тон 4). Ірмас.* Ёна прабыў тры дні ў нутры кіта, даўшы нам вобраз Цябе, Несьмятротны Хрысьце, які памёр і прабыў тры дні ў нутры зямлі.

Некалі Ты, Хрысьце, рукою Тваёю выратаваў Пятра, які ішоў па вадзе. Цяпер у міласэрнасьці Тваёй выратуй мяне, які таплюся ў буры лютых напасьцяў.

Як добры купец, ты, Пётра, пакінуў неістотнае дзеля істотнага, і набыў бясцэнную пэрлу — Хрыста.

Ты, Пётра, аддаў на сьмерць тых, што бяздумна наважыліся спакусіць Духа Сьвятога, якога ты, блаславёны, яўна, вызнаў і прапаведаваў як Бога.

*Багародзічны.* Ты нарадзіла нам у целе Слова Божае, вышэйшае за ўсякую істоту. Дзеля гэтага мы Цябе вуснамі і душою вызнаем як Багародзіцу.

***Канон 2*** *(тон 8). Ірмас.* Малітву прынясу Госпаду, і Яму скажу беды мае, бо душа мая напоўнілася злом, і жыцьцё маё наблізілася да пекла. Малюся як Ёна: "Ад тленнасьці, Божа, уздымі мяне."

Пакінуўшы багацьце сьвету, паранены любоўю Госпада і жаданьнем агульнага збаўленьня, ты захацеў быць сьведкам Яго, Паўле блаславёны, і сёньня молішся за ўвесь сьвет.

Выдатны пераймальнік Уладара, у Яго апрануты, ты, Паўле блаславёны, быў сапраўды ўсім для ўсіх, каб прыдбаць і збавіць людзей. І сапраўды ты збавіў іх, калі ўлавіў для Хрыста ўсе канцы зямлі.

Хрыстос заслужана дараваў табе, апостале Паўле, жыцьцё на нябёсах: ты быў верным слугою і распарадчыкам Ягоных тайнаў і не жадаў для сябе нічога на зямлі.

Для цябе, Паўле слаўны, Хрыстос быў жыцьцём, а сьмерць — набыткам. Ты любоўю ўкрыжаваў сябе дзеля Таго, хто быў укрыжаваны дзеля нас.

Ты, пачэсны Паўле, радуешся сёньня ў Госпадзе, бо, калі ты пакінуў цела, ты адышоў да Хрыста Бога і Жыцьцядаўца.

*Багародзічны.* Малі няспынна Сына Твайго і Бога нашага, Марыя Дзева Чыстая, каб Ён паслаў нам, верным, міласьць сваю.

**Песьня 6**

***Канон 1** (тон 4). Ірмас.* Ёна прабыў тры дні ў нутры кіта, даўшы нам вобраз Цябе, Несьмятротны Хрысьце, які памёр і прабыў тры дні ў нутры зямлі.

Некалі Ты, Хрысьце, рукою Тваёю выратаваў Пятра, які ішоў па вадзе. Цяпер у міласэрнасьці Тваёй выратуй мяне, які таплюся ў буры лютых напасьцяў.

Як добры купец, ты, Пётра, пакінуў неістотнае дзеля істотнага, і набыў бясцэнную пэрлу — Хрыста.

Ты, Пётра, аддаў на сьмерць тых, што бяздумна наважыліся спакусіць Духа Сьвятога, якога ты, блаславёны, яўна, вызнаў і прапаведаваў як Бога.

*Багародзічны.* Ты нарадзіла нам у целе Слова Божае, вышэйшае за ўсякую істоту. Дзеля гэтага мы Цябе вуснамі і душою вызнаем як Багародзіцу.

***Канон 2** (тон 8). Ірмас.* Малітву прынясу Госпаду, і Яму скажу беды мае, бо душа мая напоўнілася злом, і жыцьцё маё наблізілася да пекла. Малюся як Ёна: "Ад тленнасьці, Божа, уздымі мяне."

Пакінуўшы багацьце сьвету, паранены любоўю Госпада і жаданьнем агульнага збаўленьня, ты захацеў быць сьведкам Яго, Паўле блаславёны, і сёньня молішся за ўвесь сьвет.

Выдатны пераймальнік Уладара, у Яго апрануты, ты, Паўле блаславёны, быў сапраўды ўсім для ўсіх, каб прыдбаць і збавіць людзей. І сапраўды ты збавіў іх, калі ўлавіў для Хрыста ўсе канцы зямлі.

Хрыстос заслужана дараваў табе, апостале Паўле, жыцьцё на нябёсах: ты быў верным слугою і распарадчыкам Ягоных тайнаў і не жадаў для сябе нічога на зямлі.

*Багародзічны.* Госпад, які захацеў абнавіць маю прыроду, глянуў на Цябе і, як Сільны, вялікія рэчы ўчынуў Табе, Усебеззаганная Маці Божая, як Ты сама сказала; і выбавіў Табою мяне ад тленнасьці Бог мой у міласэрнасьці сваёй.

**Кандак** *(тон 2).* Непахісных і боганатхнёных прапаведнікаў, вяршыні апосталаў Тваіх, Ты, Госпадзе, узяў да сябе і даў ім даброты Твае і супакой; больш за ўсе цэлапаленьні іхнія высілкі і сьмерць былі прыемнымі Табе, Адзіны, што ведаеш тайны сэрцаў людзкіх.

*Ікас.* Збавіцелю мой, што напоўніў і адтуліў вусны мае, і даў языку майму ясна гаварыць, зрабі чулым сэрца маё, каб я рабіў тое, што кажу, і чыніў так, як навучаю. Бо сказана, што добры той, хто навучае і чыніць тое самае. Калі ж я кажу адно, а раблю другое, дык я як пусты звон. Дай, каб я заўжды казаў тое, што трэба, і рабіў карыснае, бо Ты адзіны, што ведаеш тайны сэрцаў людзкіх.

**Песьня 7**

***Канон 1*** *(тон 4). Ірмас.* Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам, Сыне адзінародны, блаславёны і ўсяхвальны Ты, Божа айцоў нашых!

Хоць ты, Пётра, і адрокся ад Хрыста перад Ягонымі мукамі, Боскім провідам ты атрымаў загад ісьці за Міласэрным Госпадам.

Хрыстос, што ўваскрос з магілы, яўляецца першаму табе, Пётра, як першапакліканаму і любаму вучню, і старшыні ўсіх апосталаў.

Тваё, Пётра, патройнае адрачэньне перад пакутамі Хрыстос выпраўляе патройным запытаньнем, каб пераканацца ў велічы любові тваёй.

Ты, Пётра, даў сьвядоцтва тваёй любові да Хрыста і вызнаў Яго як усябачнага Бога-Слова. Дзеля гэтага Ён даручыў табе пасьвіць Ягоны любы статак.

*Багародзічны.* Уславім Тую, што зачала ва ўлоньні цялесна Бога Слова, — які спрадвеку зазьзяў ад Айца, — як Маці Бога ўсіх.

***Канон 2*** *(тон 8). Ірмас.* На полі Дэір мучыцель паставіў печ, каб мучыць набожных, і ў ёй тры юнакі уславілі адзінага Бога, пеючы ў адзін голас: "Божа айцоў нашых, блаславёны Ты!"

Пячаць і вянец апосталаў Тваіх Павал, хоць і пакліканы апошнім, рупліваесьцю ўсіх пераўзышоў. З ім разам усе людзі пяюць: "Божа айцоў нашых, благаславёны Ты!"

Спачатку вязеньТвой, Хрысьце, Павал перасьледаваў Царкву Тваю, а пасьля сваю ранейшую дзёрзкасьць рупліваесьцю адкупіў і сабраў усе народы, якія клічуць: "Божа айцоў нашых, блаславёны Ты!"

Ты, Паўле, прапаведаваў Евангельле і навучаў па ўсёй зямлі, пачаўшы ад Ерусаліму, і дайшоў нават да Гішпаніі, усклікаючы: "Божа айцоў нашых, блаславёны Ты!"

У захапленьні ты быў узьняты да трэцяга неба, дзе пачуў галасы, якіх ніхто ня чуў, і ўсклікнуў: "Слава ўсявышняму Айцу, і Сыну, у зьзяньні роўнапасаднага Духа Божага, што дасьледуе і яўнымі робіць глыбіні!"

*Багародзічны.* Як дождж на руна, так на Цябе, Дзева, зышоў Хрыстос Бог і ўзяў цела ад Цябе. Ён злучыў раней разьдзеленае і даў супакой на зямлі і на небе. Божа айцоў нашых, блаславёны Ты!

**Песьня 8**

***Канон 1** (тон 4). Ірмас.* Ты, Хрысьце, які трымаеш усё ў руцэ Тваёй, паслаў расу набожным юнаком, што былі ўкінутыя ў полымя, і яны ўсклікнулі: "Усе стварэньні Гасподнія, блаславіце Госпада."

"Зьвяжуць рукі твае, Пётра,і прывяжуць цябе да крыжа" — Уладар прадказаў Пётру і загадаў ісьці за Ім і клікаць: "Усе стварэньні Гасподнія, блаславіце Госпада."

Янэя хворага і памёрлую Тавіту ты словам ласкі цудоўна ўваскрасіў, і яны ўсклікнулі: "Усе стварэньні Гасподнія, блаславіце Госпада."

Ты, Хрысьце, даў пазнаць Пятру, што ўсе народы чыстыя. Ачысьці сёньня духоўным сьвятлом думкі мае, каб мне клікаць: "Усе стварэньні Гасподнія, блаславіце Госпада."

*Багародзічны.* Усесьвятая Дзева, што нарадзіла ў целе Бога-Слова, разьвей малітвамі Тваімі змрок душы маёй і прасьвятлі мяне, каб мне клікаць: "Усе стварэньні Гасподнія, блаславіце Госпада."

***Канон 2** (тон 8). Ірмас.* Госпада, які на гары сьвятой уславіўся і ў вогненным незгаральным кусьце Майсею тайну Дзевы паказаў, слаўце і ўзьвялічвайце праз усе вякі.

Павал слаўны растаў у любові Тваёй і задзівіў усіх пераменаю, і ўжо не для сябе жыў, але меў у сабе Цябе, Шчодры, праз усе вякі.

Паўле баганосны, ты заручыў і прывёў, быццам нявесту, Царкву да Хрыста, і сам явіўся апекуном нявесты. За гэта Царква славіць цябе праз усе вякі.

Ты змагаўся добрым змаганьнем і скончыў жыцьцё тваё згодна з законам, захаваўшы скарб веры: дзеля гэтага Ты, Паўле, удастоіўся вянца праведнасьці.

*Багародзічны.* Радуйся, Пасад вогненны Госпада, радуйся, Нявеста незамужняя і Дзева, радуйся, Хмара, з якой зазьзяла Сонца справеднасьці. Яго мы ўзьвялічваем праз усе вякі.

**Песьня 9**

***Канон 1*** *(тон 4). Ірмас.* Цябе, усяслаўную Нявесту і ўсесьвятую Багародзіцу, што нарадзіла нам Творцу ўсяго бачнага і нябачнага, у песьнях узьвялічваем.

Сьветласьць ласкі тваёй, Пётра, зьзяе на ўвесь сьвет, і нават цень твой лечыць немачы хворых. Дзеля гэтага цябе ўзьвялічваем.

Богапраціўнага Сымона чараўніка, што чарамі сваімі ўзьняўся ў паветра, Пётра боскаю сілаю зьвёў долу і перамог. Дык уславім яго!

Малітвамі тваімі дай ачышчэньне грахоў, прасьвятленьне сэрцаў і вясельле духа для тых, што ў песьнях славяць, апостале, памяць тваю.

Ты поўны славы і сьвятасьці і годны подзіву, апостале Пётра; з вераю прымаем словы твае і з любоўю пакланяемся тваім мошчам і боскім путам.

*Багародзічны.* Дастойна, каб усе верныя аднагалосна славілі і ўзьвялічвалі Цябе, бо Ты нарадзіла радасьць усяму сьвету.

***Канон 2*** *(тон 8). Ірмас.* Ты пераўзышла законы прыроды, калі зачала Творцу і Госпада, і была для сьвету Брамаю збаўленьня. Дзеля гэтага мы Цябе, Багародзіца, няспынна ўзьвялічваем.

Пакланяемся тваім вярыгам, якія ты за Хрыста, быццам злачынца, насіў; і цалуем, Паўле, раны, якія носіш на тваім слаўным і пераможным целе.

Сёньня, апостале, ты стаўся вольным ісьці да Жаданага. Цяпер ты прабываеш з Ім, як Ягоны верны слуга, і няспыннымі малітвамі прыцягваеш да сябе слугаў тваіх.

Сёньня ты бачыш Хрыста не ў сказаньнях і не цьмяна, як у люстры, але тварам у твар, і Ён ясна яўляе табе Боства сваё.

*Багародзічны.* Ты, Усесьвятая Маці, — пахвала Хрыстовых апосталаў, слава мучанікаў, прарокаў аснова. Дзеля гэтага мы, верныя, дастойна ўзьвялічваем Цябе.

**Экзапастыляр** *(сьвяцільны). (Тон 2).* Усхвалім найвышэйшых апосталаў, боскіх Пётру і Паўла, сусьветныя сьветачы, прапаведнікаў веры, трубы багаслоўя, тлумачоў вучэньняў сьвятых, царкоўныя стаўпы і зьнішчальнікаў спакусы. (*Двойчы*)

Слава... цяпер...: Вялікая і слаўная сынараджэньня Твайго тайна, Багародзіца Дзева, Богам упадабаная нявеста. Прарокі прадказалі яе, апосталы навучалі, мучанікі вызнавалі; анёлы пяюць славу ёй, а людзі пакланяюцца.

**Пахвальныя псалмы**

*(Тон 4).* Калі Збавіцель пытаўся ў дванаццаці апосталаў: "За каго Мяне маюць людзі?", тады найлепшы з апосталаў атрымаў ласку з неба і ясна аб'явіў Ягонае Боства, кажучы: "Ты Хрыстос, Сын Бога жывога!." Дзеля гэтага ён справядліва славіцца, бо атрымаў адкрыцьцё з вышыні і ўладу вязаць і развязваць.

Хрыстос-Слова Божае, што зьявіўся ад Айца, спытаўся: "За каго Мяне лічыце?" "Ты — Сын Бога жывога" — ты, Пётра, па-багаслоўску адказаў за ўсіх. Тады Госпад сказаў: "Шчасьлівы ты, Пётра, сыне Ёны." Так ты атрымаў узнагароду, бо Бог, які праслаўляе тых, што славяць Яго, і кліча да ўдзелу ў Ягоных дабротах, паклаў цябе як непарушную скалу, на якой заснаваў і ўмацаваў Царкву сваю.

Пакліканьне тваё было з вышыні, а не ад людзей. Калі зямная цемра зацьміла вочы цялесныя, і жах нязбожнасьці агарнуў цябе, тады нябеснае сьвятло прасьвятліла вочы твайго розуму і явіла красу сапраўднай набожнасьці. Такім чынам ты пазнаў Хрыста Бога нашага, які даў зазьзяць сьвятлу ў цемры. Малі Яго за збаўленьне і прасьвятленьне душаў нашых.

Апостале Паўле, ты быў прапаведнікам Хрыста і хваліўся Ягоным Крыжом, які ты насіў у сабе. Над ўсё на сьвеце, ты выбраў Божую бязьмежную любоў, што яднала цябе з Жаданым тваім.

Таму ты і назваў сябе вязьнем Хрыстовым і цешыўся з выпрабаваньняў, што былі для цябе больш салодкімі за ўсе прысмакі. Ты ўдастоіўся пачэснага канца і адпушчэньня грахоў, бо ты жыў толькі для Госпада твайго. Малі Яго за збаўленьне і прасьвятеньне душаў нашых.

Слава...

*(Тон 6).* Пачэснае сьвята сёньня настала для Царквы Хрыстовае, сьвята апосталаў і хадайнікаў нашага збаўленьня. Дык з прасьветленай душою ўсклікнем: Радуйцеся, сьветачы, што ў цемры зьзяеце; радуйцеся Духоўнага Сонца сьветлыя промні; радуйцеся, Пётра і Паўле, Боскай навукі непахісныя асновы, прыяцелі Хрыстовыя, посуды пачэсныя; прыйдзіце нябачна да нас і зрабіце годнымі духоўных дароў усіх, што ў песьнях славяць вашую памяць.

Цяпер...

Багародзіца, Ты — сапраўдная вінаградная лаза, што ўзрасьціла нам плод жыцьця. Просім Цябе, Уладарка: разам са сьвятымі апосталамі маліся за збаўленьне душ нашых.

***Пасьля Вялікага ўслаўленьня:** Трапар "Першыя сярод апосталаў...", слава... цяпер..., "Тайна спрадвеку ўкрытая..." (гл. с. 35) і звычайнае заканчэньне сьвяточнай ютрані.*

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар** *(тон 4).* Першыя сярод апосталаў і сусьветныя настаўнікі, Уладара ўсіх маліце, каб Ён дараваў супакой усяму сьвету і душам нашым багацьце свайго зьмілаваньня.

**Кандак** *(тон 2).* Непахісных і боганатхнёных прапаведнікаў, вяршыні апосталаў Тваіх, Ты, Госпадзе, узяў да сябе і даў ім даброты Твае і супакой; больш за ўсе цэлапаленьні іхнія высілкі і сьмерць былі прыемнымі Табе, Адзіны, што ведаеш тайны сэрцаў людзкіх.

**Пракімен** *(Пс 18:5,2).* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

### Чытаньне другога лісту сьвятога апостала Паўла да Карынцянаў

Браты, калі хто асьмельваецца ў чым, — кажу як неразумны, — дык асьмелюся і я. Яны гэбрэі? Я таксама. Яны ізраільцяне? І я. Яны

семя Абрагама ? І я. Яны слугі Хрыстовыя? Кажу як неразумны: я куды больш за іх. Куды больш у працах, больш у вязьніцах, нязьмерна больш у пабоях, часта ў сьмяротнай небясьпецы. Ад гэбрэяў я атрымаў пяць разоў па сорак (удараў) без аднаго. Тройчы білі мяне палкамі, раз быў каменяваны, тры разы цярпеў караблекрушэньне: дзень і ноч прабыў я ў бездані. Часта ў дарозе, у небясьпецы на рэках, у небясьпецы ад разбойнікаў, у небясьпецы ад землякоў, у небясьпецы ад паганаў, у небясьпецы ў гарадох, у небясьпецы ў пустыні, у небясьпецы на моры, у небясьпецы ад непраўдзівых братоў; у працы, у зьнямозе, часта ня спаўшы, у голадзе, церпячы смагу, часта ў пастох, у холадзе і нагаце, ня кажучы ўжо, апроч усяго іншага, аб маім штодзённым непакою і клопатах пра ўсе цэрквы. Хто адчувае слабасьць, а я не слабею? Хто спакушаецца, а я не распаляюся? Калі ж трэба хваліцца, дык буду хваліцца маёй слабасьцю. Бог і Айцец Госпада нашага Ісуса Хрыста — блаславёны на вякі! — ведае, што не хлушу. У Дамаску намесьнік караля Арэты загадаў сьцерагчы места дамаскае, каб мяне схапіць; але мяне спусьцілі з акна па сьцяне ў кашолцы , і я ўцёк з ягоных рук. (12). Калі трэба хваліцца — хоць яно і не выпадае, — дык перайду да відзеньняў і аб'яўленьняў Госпада. Ведаю чалавека ў Хрысьце, які чатырнаццаць гадоў таму — ці ў целе, ня ведаю, ці вонках цела, ня ведаю: Бог ведае, — быў усхоплены аж да трэцяга неба. І ведаю, што той чалавек — ці ў целе, ці вонках цела, ня ведаю: Бог ведае, — быў узьняты да раю і чуў таемныя словы, якіх нельга чалавеку казаць. Такім вось буду хваліцца, сабою ж хваліцца ня буду, хіба толькі маімі немачамі. А калі б захацеў хваліцца, дык ня быў бы неразумны, але казаў бы праўду. Але паўстрымліваюся, каб нехта не падумаў больш за тое, што ўва мне бачыць або што ад мяне чуе. А каб мне не заганарыцца дзеля велічы аб'яўленьняў, дадзенае мне джала ў целе — пасланец шатана, — каб мяне прыгнятала, каб я ня ўзносіўся. Тройчы прасіў я Госпада, каб Ён аддаліў яго ад мяне. Але Ён сказаў мне: "Досыць табе Маёй ласкі, каб Мая сіла выявілася ў тваёй слабасьці." Дык таму ахвотней буду хваліцца маімі слабасьцямі, каб явілася ўва мне сіла Хрыстовая. (*11:21б-12:9*)

**Алілуя** *(Пс 88:6,8).* Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю — хоры сьвятых.

*Верш.* Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

**Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Мацьвея**

У той час Ісус прыйшоў у межы Кесарыі Піліпавае і спытаўся ў сваіх вучняў: "За каго людзі ўважаюць Сына Чалавечага?" Яны адказалі: "Адны за Яна Хрысьціцеля, іншыя за Ільлю, а іншыя яшчэ за Ярэму ці аднаго з прарокаў." Сказаў ім Ісус: "А вы за каго Мяне лічыце?" Сымон Пётра сказаў Яму ў адказ: "Ты — Хрыстос, Сын Бога

жывога." Ісус адказаў яму, кажучы: "Шчасьлівы ты, Сымоне, Сыне Ёны, бо ня цела і кроў аб'явілі табе гэта, але Айцец Мой, што ў небе. І вось я кажу табе: Ты — Пётра (скала), і на гэтай скале Я збудую Маю Царкву, і пякельныя брамы не перамогуць яе. І дам табе ключы нябеснага валадарства, і што-колечы зьвяжаш на зямлі, будзе зьвязанае ў небе, а што разьвяжаш на зямлі, будзе разьвязанае і ў небе." *(16:13-19)*

**Прычасьнік.** Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

## 30 чэрвеня

# САБОР СЬВЯТЫХ 12 АПОСТАЛАЎ

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

Якімі пахвальнымі вянкамі...; Якімі велічнымі песьнямі...; Якімі духоўнымі песьнямі.... (*Гл. вышэй, с. 31*)

*(Тон 4).* Шчасьлівыя вы, пачэсныя вучні, бо вы былі сьведкамі Слова, што аб'явілася ў целе. Як бліскучыя маланкі, вы паказаліся сьвету, і быццам духоўныя горы, струменіце слодыч. Разьдзеленыя, быццам райскія рэкі, поіце цэрквы ўсіх народаў боскімі водамі.

Быццам сьветлыя маланкі, вы былі пасланыя ў сьвет, каб прынесьці духоўнае сьвятло. Слугі тайнаў Хрыстовых, вы ўславіліся шматлікімі цудамі. Вы — табліцы пісаньняў сьвятых: ласка Божая і закон, якога Бог навучыў, напісаныя ў вас, пачэсныя тайнікі сьвятасьці.

Рыбацкімі восьцямі мудрасьць вучоных і струмені пустога красамоўства вы перамаглі, мудрасьці Божай сьветачы, настаўнікі догмаў, евангельскіх тайнаў прапаведнікі. Сёньня вы сталіся ўдзельнікамі нябесных дабротаў і подзівам для анёлаў, і жывеце вечна ў славе.

Слава ...

*(Тон 6).* Пачэснае сьвята сёньня настала для Царквы Хрыстовае, сьвята апосталаў і хадайнікаў нашага збаўленьня. Дык з прасьветленай душою ўсклікнем: Радуйцеся, сьветачы, што ў цемры зьзяеце; радуйцеся, духоўнага Сонца сьветлыя промні; радуйцеся, Пётра і Паўле, Боскай навукі непахісныя асновы, прыяцелі Хрыстовыя, посуды пачэсныя! Прыйдзіце нябачна да нас і зрабіце годнымі духоўных дароў усіх, што ў песьнях славяць вашую памяць.

Цяпер ...

*Дагматык (тон 6).* Хто Цябе не назаве шчасьліваю, Найсьвятая Дзева, хто ня будзе славіць, Чыстая, мацярынства Тваё? Адзінародны Сын, што спрадвеку зазьзяў ад Айца, ад Цябе, прыняўшы цела, у невыказны спосаб нарадзіўся. Праўдзівы Бог, Ён стаўся праўдзівым чалавекам дзеля нас, непадзельны на дзьве

асобы, але ў дзьвюх нязьлітных прыродах пазнавальны. Малі Яго, Чыстая і Блаславёная, даць зьмілаваньне душам нашым.

**Вершапесьні**

*(Тон 4).* Ты даў пачэсных Тваіх апосталаў, што зазьзялі, быццам духоўныя сьветачы, на хвалу Царкве Тваёй. Дзьве духоўныя зоркі, Пётра і Павал, увесь сьвет асьвяцілі: імі Ты разагнаў цемру заходнюю, Ісусе ўсемагутны, Збавіцелю душ нашых.

*Верш.* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

Ты даў на ўмацаваньне Царкве Тваёй Пятрову трываласьць і Паўлаў розум; поўныя боскай мудрасьці, яны перамаглі спакусы паганаў. Дзеля гэтага, настаўленыя таемна імі, славім Цябе, Ісусе ўсемагутны, Збавіцелю душ нашых.

*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

Ты даў нам двух апосталаў Тваіх як прыклад навяртаньня грэшнікаў: адзін з іх адрокся ад Цябе ў час небясьпекі, а пасьля пакаяўся; другі супраціўляўся вучэньню Твайму, а пасьля ўверыў. Абодва сталіся першымі сярод прыяцеляў Тваіх, Ісусе ўсемагутны, Збавіцелю душ нашых.

Слава...

*(Тон 6).* Радасная ўрачыстасьць зазьзяла сёньня на ўвесь сьвет, пачэсная памяць мудрых Пятра і Паўла, першых сярод апосталаў. Рым радуецца, сьвяткуе і ў песьнях славіць іх; сьвяткуйма ж і мы , браты, і ўшануйма гэты сьветлы дзень. Усклікнем: "Радуйся, Пётра апостале, шчыры прыяцель Настаўніка твайго, Хрыста Бога нашага! Радуйся, Павал любы, прапаведнік веры і сусьветны настаўнік! Выбраная сьвятая пара, што мае моц вялікую, малі Хрыста Бога нашага за збаўленьне душаў нашых."

Цяпер...

*(Тон 6).* Багародзіца, Ты — сапраўдная вінаградная лаза, што ўзрасьціла нам плод жыцьця. Просім Цябе, Уладарка: разам са сьвятымі апосталамі маліся за збаўленьне душаў нашых.

**Адпушчальныя трапары**

*(тон 4).* Першыя сярод апосталаў і сусьветныя настаўнікі, Уладара ўсіх маліце, каб Ён дараваў супакой усяму сьвету і душам нашым багацьце свайго зьмілаваньня.

Слава...

*(Тон 8).* Па ўсёй зямлі разышлося навучаньне вашае, сьвятыя, бо вы атрымалі Духа ў выглядзе вогненных языкоў, спалілі ідальскую спакусу і сецямі словаў вашых улавілі для веры людзей, што заблудзілі. Таму нябёсы абвяшчаюць вашую славу, і аб учынках вашых расказвае небасхіл; і мы таксама спраўляем вашую памяць і ўсклікаем: "Збаў, Божа, усіх нас малітвамі апосталаў Тваіх!"

Цяпер...

*(Тон 8).* Ты, што дзеля нас нарадзіўся ад Дзевы і на крыжы пацярпеў, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць і паказаўшыся Богам ва ўваскрасеньні, не пагардзі творамі рук Тваіх, пакажы чалавекалюбства Тваё, Міласэрны, прымі малітвы за нас Багародзіцы, што нарадзіла Цябе, і збаў, Збавіцелю добры наш, людзей бездапаможных.

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар апосталам** *(тон 4).* Першыя сярод апосталаў ....

*(Тон 8).* Па ўсёй зямлі разышлося навучаньне ваша... *(гл. вышэй)*

**Кандак** *(тон 2).* Сёньня Камень-Хрыстос услаўляе камень веры — першага з апосталаў, — і разам з ім Паўла і ўвесь дванаццацілікі сабор. Мы ж сьвяткуем іхнюю памяць і славім Таго, хто іх уславіў.

**Пракімен** *(Пс 18:5,2).* Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.
*Верш.* Нябёсы абвяшчаюць славу Божую, аб творах рук Ягоных расказвае небасхіл.

**Чытаньне першага лісту Апостала Паўла да Карынціянаў**

Браты, Бог паставіў нас, апосталаў, апошнімі, быццам засуджаных на сьмерць. Мы сталіся відовішчам для сьвету, для анёлаў і людзей. Мы неразумныя дзеля Хрыста, вы разумныя ў Хрысьце; мы слабыя, вы моцныя; вы ў пашане, а мы ў няславе. Аж да гэтага часу мы церпім голад і смагу, не стае нам вопраткі, зносім пабоі і туляньне, мы занятыя працаю ўласных рук. Бласлаўляем, калі нас зьневажаюць, церпім, калі нас перасьледуюць;

молімся, калі нас абмаўляюць. Мы сталіся, быццам сьмецьце гэтага сьвету, як адкіды для ўсіх аж дагэтуль. Не пішу гэта, каб вас засаромець, але каб, як дзяцей маіх любых, наставіць на розум. Бо хоць бы вы мелі тысячы настаўнікаў у Хрысьце, але няшмат бацькоў; я ж вас нарадзіў праз Евангельле ў Хрысьце Ісусе. Дык прашу вас: будзьце маімі перяймальнікамі. *(4:9-16)*

**Алілуя** *(Пс 88:6,8).* Нябёсы славяць цуды Твае, Госпадзе, і вернасьць Тваю — хоры сьвятых.

*Верш.* Бог праслаўлены ў мностве сьвятых.

**Чытаньне сьвятога Евангельля паводле Мацьвея**

У той час Ісус убачыў вялікі натоўп людзей і зьлітаваўся над імі, бо яны былі зьнямоганыя і пакінутыя, быццам авечкі, што ня мелі пастуха. Тады сказаў Ён вучням сваім: "Жніво вялікае, але работнікаў мала. Дык прасеце Гаспадара жніва, каб Ён паслаў работнікаў на жніво сваё." (10). Тады паклікаў Ён дванаццаць сваіх вучняў і даў ім уладу над нячыстымі духамі, каб выганялі іх і лячылі ўсялякую немач і хворасьць. А вось імёны дванаццацёх апосталаў: першы Сымон, званы Пётрам, і брат ягоны Андрэй; потым Якуб, сын Забэдэя, і Ян, брат яго; Піліп і Баўтрамей, Тамаш і Мацьвей мытнік; Якуб, сын Алфея, і Тадэй; Сымон Кананіт і Юда Іскарыёт, які прадаў Яго. Гэтых дванаццаць Ісус паслаў, даючы ім загад: "Не ідзеце да паганаў і не заходзьце да местаў самаранскіх. Ідзеце лепш да авечак дому Ізраіля, што загінулі. Ідзеце і абвяшчайце, што валадарства нябеснае ўжо блізка. Аздараўляйце хворых, уваскрашайце памёрлых, ачышчайце пракажоных, выганяйце духаў. Дарам атрымалі, дарам і давайце. *(9:36-10:8)*

**Прычасьнік.** Па ўсёй зямлі разышоўся голас іх, і аж да канцоў сьвету словы іх.

# КАТАВАСІЯ АГУЛЬНАЯ

1. Адчыню вусны мае, і напоўняцца Духам; слова скажу ў гонар Уладаркі Маці, і стану сьвяткаваць сьветлую ўрачыстасьць і славіць радасна ў песьнях цуды Яе.

3. У боскай славе Тваёй, Багародзіца, жывая і невычэрпная Крыніца, умацуй аднадушны хор песьняроў Тваіх і зрабі іх дастойнымі вянцоў славы.

4. Хрыстос, Бог спрадвечны, што сядзіць у славе на боскім пасадзе, прыходзіць на хуткай хмары і нятленнай рукою збаўляе тых, што клічуць: "Слава, Хрысьце, сіле Тваёй!"

5. Усё стварэньне сумелася, убачыўшы боскую славу Тваю: Ты, Дзева, што мужа ня знала, мела ва ўлоньні Бога ўсіх і нарадзіла спрадвечнага Сына, які дае супакой усім, што славяць Цябе.

6. На гэтую боскую і слаўную ўрачыстасьць Божай Маці прыйдзіце, усе багамудрыя, пляскайце ў далоні і слаўце Таго, хто нарадзіўся ад Яе.

7. Мужныя і багамудрыя юнакі не захацелі служыць стварэньню замест Творцы і, вогненнае выпрабаваньне за нішто палічыўшы, радасна сьпявалі: "Усяхвальны Госпад і Бог айцоў, блаславёны Ты."

8. Народжаны ад Багародзіцы набожных юнакоў у печы выбавіў; тады вобразна, а цяпер дзейсна натхняе Ён увесь сьвет пяяць: "Слаўце, усе стварэньні, Госпада і ўзьвялічвайце Яго на ўсе вякі."

9. Усе народжаныя на зямлі хай усьцешацца, прасьветленыя Духам. Хай сьвяткуюць бесьцялесныя анельскія хоры і ўшануюць урачыстасьць Божае Маці, і хай пяюць: "Радуйся, усеблаславёная Багародзіца, чыстая заўсёды Дзева!"

## АДПУШЧАЛЬНЫЯ ТРАПАРЫ БАГАРОДЗІЧНЫЯ ВАСЬМІ ТОНАЎ

ТОН 1

*У нядзелю вечарам:* Усё стварэньне цешыца, убачыўшы цуд над цудамі, які зьдзейсьніўся ў Табе, Поўная ласкі: Ты зачала бяз семя і нарадзіла Таго, на каго анельскія хоры ўзірацца ня сьмеюць. Малі Яго за душы нашыя.

*У панядзелак і сераду вечарам:* Поўная ласкі Багародзіца, Ты, не апёкшыся, зачала Боскі Агонь, і нарадзіла бяз семя Крыніцу жыцьця — Госпада. Збаўляй тых, што ўзьвялічваюць Цябе.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Маючы Цябе, Усячыстая, сваёй заступніцай, і вызваленыя Тваімі малітвамі ад цяжкіх бедаў, крыжом Сына Твайго ахоўваныя, Цябе, як належыць, пабожна ўзьвялічваем.

*У пятніцу вечарам:* Як толькі пачуўся голас Габрыеля, які казаў Табе, Дзева: "Радуйся!", Уладар усіх узяў цела ад Цябе, сьвятая Скарбніца, як прадказаў праведны Давід. Ты сталася больш прасторнай за неба, бо насіла ў сабе Тварца ўсяго. Слава Таму, хто пасяліўся ў Табе; слава Таму, хто выйшаў з Цябе; слава Таму, хто вызваліў нас нараджэньнем сваім."

ТОН 2

*У нядзелю вечарам:* Крыніца міласэрнасьці, Багародзіца, зрабі нас годнымі спагады Твае: глянь міласьціва на людзей, што зграшылі, і пакажы, як заўсёды, сілу Тваю, бо мы, на цябе спадзеючыся, "Радуйся!" усклікаем Табе, як некалі Габрыель, анёлаў начальнік.

*У панядзелак і сераду вечарам:* Дзякуючы Табе, Багародзіца Дзева, мы сталіся саўдзельнікамі Боскай існасьці, бо Ты нарадзіла нам Бога ў целе. Дзеля гэтага мы Цябе, як належыць, з пашанаю ўзьвялічваем.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Ты годная ўсякай хвалы, Багародзіца Дзева, мы славім Цябе: крыжом Сына Твайго пекла зруйнаванае было, сьмерць зьнішчожаная, мы, памёрлыя, усталі і жыцьця ўдастоіліся, рай атрымалі — ранейшую асалоду. Дзеля гэтага, дзякуючы, славім Яго, як усяўладнага Хрыста Бога нашага і адзінага міласэрнага.

*У пятніцу вечарам:* Вышэй за розум ўсяслаўныя тайны Твае, Багародзіца: зьбярогшы чысьціню і захаваўшы дзявоцтва, Ты

несумненна сталася Маці, нарадзіўшы Бога праўдзівага. Малі Яго за збаўленьне душаў нашых.

ТОН 3

*У нядзелю вечарам:* Красе дзявоцтва і сьветлай чысьціні Тваёй Багародзіца, Габрыель зьдзівіўся і ўсклікнуў: "Якую дастойную пахвалу прынясу Табе, як Цябе назаву? Ня ведаю і жахаюся і, як мне было загадана, клічу: "Радуйся, Поўная ласкі!"

*У панядзелак вечарам:* Прыстанішча і сіла наша, Багародзіца, моцная памочніца сьвету ўсяму! Малітвамі Тваімі захавай слугаў Тваіх ад усякіх бедаў, адзіная Блаславёная.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Мы прыдбалі сабе жэзл сілы — крыж Сына Твайго, Багародзіца, і перамагаем ім варожае зухвальства, з любоўю ўзьвялічваючы Цябе.

*У сераду вечарам:* Прарокі прапаведавалі, апосталы навучалі, мучанікі вызнавалі, а мы ўверылі, што Ты сапраўды Багародзіца: дзеля гэтага ўзьвялічваем Тваё невыказнае сынараджэньне.

*У пятніцу вечарам:* Цябе, хадайніцу за збаўленьне наша, славім, Багародзіца Дзева, бо целам, якое Ён узяў ад Цябе, Сын Твой і Бог наш на крыжы пацярпеў і як Чалавекалюбец ад тленнасьці выбавіў нас.

ТОН 4

*У нядзелю вечарам:* Узгадаванай у сьвятыні, у сьвятым сьвятых, апранутай у веру, і мудрасьць, і веліч дзявоцтва арханёл Габрыель з неба прынёс прывітаньне, кажучы: "Радуйся Блаславёная; радуйся, Усяслаўная: Госпад з Табою."

*У панядзелак вечарам:* Да Багародзіцы сёньня сьпешна пойдзем, грэшныя і пакорныя, і прыпадзем да Яе, каючыся і ўсклікаючы з глыбіні душы: "Уладарка наша, памажы! Пакажы ласку Тваю, сьпяшайся, бо гінем у безьлічы правін. Не пакінь нас з нічым, бо Ты адзіная надзея наша."

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Дзева беззаганная, Маці Хрыста Бога, меч прабіў Тваю найсьвятую душу, калі Ты бачыла дабравольна расьпятага Сына і Бога Твайго. Не пераставай маліць Яго, Блаславёная, каб Ён даў нам адпушчэньне грахоў.

*У сераду вечарам:* Слова Айца — Хрыста Бога нашага, — ад Цябе ўцелаўлёнага мы пазналі, Багародзіца Дзева, адзіная чыстая,

адзіная блаславёная. Дзеля гэтага Цябе няспынна ў песьнях славім.

*У пятніцу вечарам:* Тайна спрадвеку ўкрытая і анёлам няведамая праз Цябе, Багародзіца, тым, што жывуць на зямлі, сталася яўнаю: Бог прыняў цела ад Цябе, спалучыўшы ў сабе без зьліцьця дзьве прыроды і, пацярпеўшы дзеля нас дабравольна на крыжы, уваскрасіў ім першастворанага і выбавіў ад сьмерці душы нашыя.

**ТОН 5**

*У нядзелю вечарам:* З анёламі ў небе і з людзьмі на зямлі радасным голасам, Багародзіца, клічам: "Радуйся, брама больш прасторная за неба! Радуйся, адзінае збаўленьне тых, што на зямлі! Радуйся, Чыстая і Поўная ласкі, што нарадзіла Бога ў целе!"

*У панядзелак вечарам:* Хуткую абарону і дапамогу, і міласэрнасьць Тваю пакажы, Чыстая, слузе Твайму: суцішы марныя думкі і ўпаўшую душу маю падымі, Багародзіца, бо я ведаю, што можаш усё.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Крыжом Сына Твайго, Багародзіца ласкі поўная, ідальская мана была зьнішчаная і сіла дэманская пераможаная; дзеля гэтага мы, верныя, Цябе, як належыць, бласлаўляем і, вызнаючы Цябе Маці Божаю, дастойна ўзьвялічваем.

*У сераду вечарам:* Дзіўная і збавенная тайніца Дзевы аб'явілася сьвету, бо ад Яе нарадзіўся Ты бяз семя і паказаўся нятленным у целе: усіх радасьць, Госпадзе, слава Табе.

*У пятніцу вечарам:* Радуйся, брама Гасподняя непраходная! Радуйся, ахова і апякунка тых, што прыходзяць да Цябе! Радуйся, ціхае прыстанішча! Радуйся Ты, што без мужа нарадзіла ў целе Тварца і Бога Твайго! Не пераставай маліцца за тых, што славяць Народжанага ад Цябе і пакланяюцца Яму.

**ТОН 6**

*У нядзелю вечарам:* Пачаткам збаўленьня сталася для нас дабравешчаньне Габрыеля Дзеве: пачуўшы "Радуйся!" ад яго, Яна не адкінула прывітаньня і не ўсумнілася, як некалі Сара, але адказала: "Вось я служка Гасподняя, хай станецца са мною паводле слова твайго."

*У панядзелак вечарам:* Надзея сьвету, блаславёная Багародзіца Дзева! Просім Твайго адзінага сільнага заступніцтва: зьмілуйся

над людзьмі бездапаможнымі і малі міласэрнага Бога выбавіць душы нашы ад усякай пагрозы, адзіная Блаславёная.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Багародзіца Дзева, малі Сына Твайго, Хрыста Бога нашага, які дабравольна быў расьпяты на крыжы і выбавіў сьвет ад маны, каб Ён зьмілаваўся над душамі нашымі.

*У сераду вечарам:* Сьвятая Уладарка, Чыстая Маці Бога нашага, што нарадзіла ў невыказны спосаб Тварца ўсіх, са сьвятымі апосталамі малі безустанку Ягоную дабрату, каб вызваліў нас ад грэшных пажаданьняў і даў прабачэньне грахоў.

*У пятніцу вечарам:* Ты, што назваў Маці Тваю блаславёнаю, аддаў сябе дабравольна на мукі і зазьзяў на крыжы, каб знайсьці Адама і кажучы анёлам: "Радуйцеся са мною, бо я знайшоў згубленую драхму." Божа, што ўсё мудра ўладкаваў, слава Табе!

**ТОН 7**

*У нядзелю вечарам:* Багародзіца, Дзева Чыстая! Разам з анёламі малі Сына Твайго, каб, перш чым прыйдзе канец, даў прабачэньне тым, што верна славяць Цябе.

*У панядзелак вечарам:* "Радуйся!" — кажам Табе, Багародзіца, бо Ты паказалася вышэйшай за анёлаў, нарадзіўшы Бога.

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Расьпятага за нас Хрыста Бога, які зьнічшчыў пекла ўладу, безупынна малі, Багародзіца Дзева, за збаўленьне душаў нашых.

*У сераду вечарам:* Спаўненьнем прарокаў і закону ёсьць плод улоньня Твайго, Усячыстая. Дзеля гэтага, ведаючы Цябе як Багародзіцу, славім і набожна ўзьвялічваем Цябе.

*У пятніцу вечарам:* Скарбніца нашага ўваскрасеньня, Усяхвальная, што, нарадзіўшы Збавіцеля, вызваліла падуладных граху, выратуй тых, што спадзяюцца на Цябе, з бяздоннай ямы правінаў — Ты, якая перад родамі была Дзеваю, і падчас родаў Дзеваю, і пасьля родаў засталася Дзеваю.

**ТОН 8**

*У нядзелю вечарам:* Радуйся, што праз анёла Радасьць сьвету прыняла! Радуйся, што нарадзіла Тварца Твайго і Госпада! Радуйся, што ўдастоілася стаць Маці Божаю!

*У панядзелак вечарам:* Непарушнае ўмацаваньне веры і пачэсны дар душ нашых, Багародзіцу ў песьнях, верныя, узьвялічым:

"Радуйся, што ва ўлоньні Тваім зьмясьціла Камень Жыцьця! Радуйся, надзея ўсіх канцоў сьвету, сумных Заступніца! Радуйся, Дзева Маці!"

*У аўторак і чацьвер вечарам:* Убачыўшы на крыжы расьпятага Цябе, Ягнё і Пастыра, і Збавіцеля сьвету, Маці Твая з плачам казала: "Сыне і Божа мой, сьвет радуецца, атрымаўшы вызваленьне, а сэрца маё гарыць, бачачы Тваё распяцьце, якое Ты церпіш за ўсіх."

*У сераду вечарам:* Духоўная брама жыцьця, Усячыстая Багародзіца! Вызваль ад бедаў верных, што прыбягаюць да Цябе, каб нам славіць Тваё сьвятое сынараджэньне для збаўленьня душ нашых.

*У пятніцу вечарам:* Ты, што дзеля нас нарадзіўся ад Дзевы і на крыжы пацярпеў, сьмерцю зьнішчыўшы сьмерць і паказаўшыся Богам ва ўваскрасеньні, не пагардзі творамі рук Тваіх, пакажы чалавекалюбства Тваё, Міласэрны, прымі малітвы за нас Багародзіцы, якая нарадзіла Цябе, і збаў, Збавіцелю добры наш, людзей бездапаможных.